Літаратурная Беларусь

Выпуск №2 (150)
(люты)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»


lit-bel.org
novychas.by

Змест

Ён чытаў зоры

Жменя згадак пра Алеся Пісьмянкова

Леанід ЛЕВАНОВІЧ



Фота www.mogilev.by

Быў светлы, трошкі зажураны, вераснёўскі дзень. Мы з Алесем выбраліся ў грыбы. Ён прыехаў да мяне на Вілейшчыну. Маю родную вёску Клеявічы, прыгожую, песенную, што маляўніча цягнулася паўз Бесядзь, знішчыў Чарнобыль. Алесевы Бялынкавічы, што стаяць таксама на Бесядзі, — наўпрост ад маёй кіламетраў дзесяць, — ацалелі.

Верасень у 2003 годзе быў грыбны. Алесь прыехаў павіншаваць мяне з 65-годдзем. Сабраліся суседзі, амаль усе жыхары невялікай лясной вёсачкі Пятрылава. Алесь быў у добрым гуморы, дасціпна, весела жартаваў, ягоны густы басавіты голас уладарыў у застоллі. Ён тады працаваў галоўным рэдактарам часопіса «Вожык». Я слухаў Алеся, пазіраў на яго адухоўленае, паэтычнае аблічча: русявы чуб, пшанічныя вусы, сінія вочы, ды яшчэ прозвішча — Пісьмянкоў... Яму лёсам наканавана пісаць, думаць вершы — так вызначыў сваё крэда сам Паэт.

Пасля вячэры мы выйшлі на праходку. Ужо ацямнела, цёмнаю зубчастаю сцяною з усіх бакоў вёску абступаў лес.

— Ваша Пятрылава стаіць, як у вянку, — дзівіўся Алесь. — А ядловец вы пасадзілі?

Госця зацікавілі вастраверхія, нібы малыя кіпарысы, ядлоўцавыя дрэўцы паабапал гаражных варот, яны стаялі быццам вартавыя.

— Так. Ім ужо дзесяць гадоў. А ліпы пасадзіў у 1987-м. Тады ж набыў гэтую хату. Малыя ліпкі выкапаў на былым хутары, дзе перад вайною нарадзілася мая будучая жонка... Ліпавую алею — дванаццаць дрэўцаў — я пасадзіў насуперак Чарнобылю. У той год набыў пчаліны рой.

Цемра пагусцела, на небе высыпалі мігатлівыя зоры. Месяц тады ўзыходзіў позна, ягонае святло не перашкаджала зоркам выяўляць усю сваю моц. Вядома, што самыя буйныя і яркія зоркі бываюць напрыканцы лета і ў пачатку восені, быццам яны даспелі за лета.

— О, Кірэевіч, глядзіце: Палярная зорка акурат над вашай хатай, — узрадавана мовіў Алесь. — А якая Венера яркая! Добрая беларуская назва яе — Мілавіца. Вацлаў Ластоўскі вычытаў у летапісах, што Венера называлася — гвязда Чагір. А Плеяды — Сітца або Вуцінае Гняздо...

На паўночным Усходзе мы адшукалі мігатлівую купку зорак — Плеяды-Сітца, знайшлі сузор'е Касіяпеі, яркія зоркі Вялікага Воза і Малога Воза — сёмая зорка яго і ёсць Палярная. Алесь прызнаўся: са школьных гадоў любіць астраномію. Я зразумеў, што назва зборніка «Чытаю зоры» зусім невыпадковая.

Той ноччу, пасля паходу ў грыбы, чытання зораў я доўга не мог заснуць: успаміны агарнулі мяне. Прыгадаўся ўжо далёкі жнівень 1980 года. Я тады пачаў працаваць на Беларускім тэлебачанні на пасадзе галоўнага рэдактара літаратурна-драматычных праграм. Першай перадачай, якую мне давялося весці, сталася перадача «Мой родны кут» — аб родных мясцінах славутага паэта Аркадзя Куляшова. Сцэнарый напісала яго дачка Валянціна. Мы наведалі Саматэвічы, родную вёску паэта, запісалі размову з яго настаўнікам Брыльянтавым, іншымі аднавяскоўцамі. Ад маіх Клеявічаў да Саматэвічаў сем вёрст. Падлеткам я хадзіў у Саматэвічы на кірмаш — у гэтым слынным мястэчку праводзіліся штогод кірмашы: на Іллю 2 жніўня і на Змітра 8 лістапада. Іллінскі кірмаш пачынаўся з усходам сонца — дарэчы, на яго любіў прыязджаць Куляшоў.

Алесь успамінаў, што часта ездзіў з бацькам, калгасным шафёрам, на кірмаш у Саматэвічы. Мы здымалі перадачу «Мой родны кут» — пра Куляшоўскія мясціны напрыканцы жніўня, калі кірмаш ужо адшумеў. У сцэнарыі быў запланаваны сюжэт пра маладога паэта Пісьмянкова. Я чытаў яго вершы ў раённай газеце, былі Алесевы радкі і ў сцэнарыі, але сустрэцца нам пакуль што не давялося.

Сонца ўжо звярнула з паўдня, калі мы прыехалі ў Бялынкавічы, вялікае прыгожае паселішча на беразе Бесядзі, ракі, якую Аркадзь Куляшоў уславіў на ўвесь свет. Думалася пра жыццядайнасць Прыбесяддзя, якое нарадзіла новага паэта.

Я слухаў Алеся, пазіраў на яго адухоўленае, паэтычнае аблічча: русявы чуб, пшанічныя вусы, сінія вочы, ды яшчэ прозвішча — Пісьмянкоў... Яму лёсам наканавана пісаць, думаць вершы

Запісвалі сінхрон з Алесем у светлым класе мясцовай школы. Усхваляваны юнак з русявым чубам і пшанічнымі вусамі, валошкавымі вачыма, у светла-ружовай кашулі глядзеўся вельмі прывабна. Уразіў густым басавітым голасам, уразіў вершамі — кароткімі, ёмістымі. Іх так і хочацца цытаваць і цытаваць: «Над вёскай дымок гаркавы. / Размова касы з атавай. / У дом пад крылом бусліным / Жанчыны ідуць на радзіны. / Расчулены бацька надзіва — / Сын нарадзіўся. Радзіміч. / Маці трывожыцца: «Сыне...» / Вочы ў сына — сінія. /...Радзіны. / Радзіміч. /Радзіма»...

Слухаў я вершы, любаваўся прыгожым, адухоўленым абліччам юнага земляка, і сэрцам, і розумам адчуў: у прыгожай вёсцы з паэтычнай назвай Бялынкавічы нарадзіўся таленавіты паэт. На агульнастудыйнай лятучцы тэлеперадачу пахвалілі. Генадзь Бураўкін, тагачасны старшыня Дзяржтэлерадыё, — менавіта ён перацягнуў мяне з часопіса «Полымя» на БТ, — сказаў, што мой першы блін аказаўся не камяком, а хлопец, які чытаў вершы, яго вельмі зацікавіў.

Пасля гэтага мы сустракаліся з Алесем даволі часта, прычым часцей на радзіме, чымся ў Мінску. Урэзалася ў памяць сустрэча ў Касцюковічах. Запрасілі нас, літаратараў-землякоў (Івана Чыгрынава, Алеся Пісьмянкова і мяне) на юбілей вызвалення раёна ад фашысцкай навалы. Было тое свята 28 верасня 1993-га — дата самавітая, круглая — 50 гадоў з дня вызвалення Касцюкоўшчыны. Асабліва хваляваўся Іван Чыгрынаў: яму надалі званне Ганаровы грамадзянін Касцюковіцкага раёна, павязалі цераз плячо шырокую чырвоную стужку. Дарэчы, такую ж стужку павязалі і мне ў 2009 годзе. На вялікі жаль, Чыгрынава і Пісьмянкова ўжо не было з намі...

На юбілеі вызвалення Алесь прачытаў верш, прысвечаны ветэранам. Верш моцны, прачулы, і чытаў аўтар узнёсла, на ўсю моц голасу. І ўзнагародай яму былі воплескі шматтысячнай аўдыторыі — людзі сабраліся на плацы ў цэнтры горада.

Далёка не ўсе паэты ўмеюць выразна, па-майстэрску чытаць свае вершы, у Алеся гэта атрымлівалася вельмі хораша. А калі яго абралі сакратаром Саюза пісьменнікаў, у яго раскрыўся талент вядоўцы вечарынаў у Доме літаратара. Яго прыемна было слухаць, і прыемна глядзець на яго зграбную постаць у строгім гарнітуры. Ён меў выдатную памяць і мог сказаць цёплую, змястоўную прамову пра юбіляра ці аўтара кнігі, з нагоды выхаду якой адбывалася імпрэза. І ён ніколі не чытаў з паперчыны, сыпаў дасціпнымі жартамі. Нездарма пазней яго прызначылі галоўным рэдактарам часопіса «Вожык». Цікавая дэталь: раней рэдагаваў гумарыстычны часопіс таленавіты журналіст, таксама выхадзец з Касцюкоўчыны Аляксандр Данілавіч Раманаў. Значыць, у Прыбесяддзі жывуць самыя вясёлыя людзі. А вось па колькасці народных — у нас два: Аркадзь Куляшоў, Іван Чыгрынаў, — Касцюковіцкі раён саступае Ушацкаму. Адтуль выйшлі: Пятрусь Броўка, Васіль Быкаў, Рыгор Барадулін.

Але вернемся ў Дом літаратара на імпрэзу, дзе рэй вядзе Алесь Пісьмянкоў. А сабраўся народ на вечарыну, прысвечаную ўручэнню Літаратурнай прэміі Саюза пісьменнікаў: прэмію імя Івана Мележа ўручалі аўтару гэтых радкоў за кнігу «Ларыса, альбо Каханне аўтамабіліста», прэмію імя Аркадзя Куляшова — Сяргею Панізніку за падрыхтоўку дзіцячых кніг у выдавецтве «Юнацтва». Дыпломы ўручыла кіраўнік Саюза Вольга Іпатава, а вечарыну вёў Алесь. Вось тады, а было гэта ў сакавіку 2000-га, — я, так бы мовіць, — адчуў на сабе, як умеў Пісьмянкоў сказаць добрае слова пра калегу-літаратара. Хоць прэмію далі за «Ларысу...», вядоўца болей гаварыў пра мае раманы, а на той час ужо «выляцелі» кнігаю «Шчыглы», «Паводка сярод зімы», «Дзікая ружа». У «Полымі» надрукаванае «Сіняе лета» — адным з першых чытачоў гэтага рамана быў Алесь, ён тады працаваў у часопісе.

Напрыканцы вечарыны адбылася сяброўская замочка прэмій. Алесь вёў рэй і ў застоллі, на хаду прыдумляў каламбуры, расказваў анекдоты, усе рагаталі, звонка смяялася яснавокая прыгажуня Вольга Іпатава, гэта яшчэ болей натхняла Алеся. Такім вясёлым я не бачыў яго ніколі.

Жыць заставалася Алесю Пісьмянкову чатыры гады...

А цяпер пра тое, як мне пашчасціла рэдагаваць Алесеву кнігу. Так, менавіта пашчасціла, бо за дзяржаўныя грошы я меў чытацкую асалоду. А гісторыя вось якая.

Працяг на стар. 9 (3) »

«ПУНКТ АДЛІКУ»


Кацярына Захарэвіч. Час Вогненнага Птушкалова

Захарэвіч К. Час Вогненнага Птушкалова: аповесць. — Мінск: Кнігазбор, 2018. — 144 с. — (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; Пункт адліку).



Пятнаццацігадовая Бася не ўяўляла, хто яна такая, пакуль у дзверы іх з мамай хаты не пастукаліся жаўнеры князя Свету. Яны вышукваюць адметных — ра́су, якую чамусьці вельмі не любяць звычайныя людзі. Схавацца ад пераследу можна толькі ў паселішчы сярод глухога лесу за непаслухмянай Хітрай ракой. Як толькі Бася зачыняе дзверы хаты, шляху назад для яе не застаецца...

Ольга Юдина. Тараканы



Юдина О. Тараканы. — Минск : Кнігазбор, 2018. — 168 с. — (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; Пункт адліку).

У вас ёсць прусакі? Не-не, не ў кватэры. У галаве. Вы добра з імі знаёмыя? Можа, вы нават здолелі пасябраваць? Калі так, вы — малайчына, бо прарабілі вялікую працу над сабой. А цяпер уявіце, што замест сваіх вы пачалі бачыць прусакоў у іншых людзей. Вы зможаце жыць звыклым жыццём ці з'едзе з глузду? Магчыма, вы палюбіце іх больш, чым самага блізкага чалавека...

Чытайце адну з версій развіцця такіх падзей у абсурдна-фантастычнай аповесці «Тараканы».

Александр Веледимович. Золотое время

Веледимович А. Золотое время, или Занимательные приключения Шуры Переплётова в окрестностях города Витебска, правдиво сочинённые под воздействием трёх муз и одного рассказа таинственного призрака, а иногда подсмотренные с высоты птичьего полёта. — Минск: Кнігазбор, 2018. — 100 с. — (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; Пункт адліку).

Гэта — зборнік навел пра жыццё Шуры Пераплётава ў Віцебску. Аўтар пераплятае гістарычныя факты з гарадскімі міфамі і літаратурнымі цытатамі. Забабоны шляхты, войны, падпольны рок-н-рол і паездкі на паветраным трамваі ператвараюцца ў новыя легенды пра горад на беразе Заходняй Дзвіны...

Дар'я Трайдэн. Крыштальная ноч

Трайдэн Д. Крыштальная ноч: апавяданні / Дар'я Трайдэн. — Мінск: Кнігазбор, 2018. — 96 с. — (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; Пункт адліку).



«Крыштальная ноч» — гэта вянок, сплецены з гісторый пра крохкасць, прыгажосць, Беларусь і смерць. Вобраз крышталю сустракаецца ў кожным аповедзе. Крышталь грае ад месячных промняў, адбівае святло, асвятляючы ці, наадварот, дазваляючы ўбачыць патаемнае, прыхаванае, інтымнае.

Паэтычны, міжнародны...

У зале рэстарана «Сёмае неба» адбылося ўрачыстае адкрыццё Восьмага міжнароднага паэтычнага фестывалю «Вершы на асфальце» імя Міхася Стральцова.



Фота СБП

Першы дзень традыцыйна меў урачысты характар, бо менавіта падчас адкрыцця праходзяць цырымоніі ўручэння дзвюх літаратурных прэмій: адной з найстарэйшых — прэміі часопіса «Дзеяслоў» «Залаты апостраф» і адной з самых новых — імя Міхася Стральцова. Апошняя з узнагародаў, прэмія імя Міхася Стральцова, была ўпершыню ўручаная летась, калі ёй быў уганараваны паэт Алег Мінкін. Як і ў мінулы раз, усё трымалася ў сакрэце да апошняй хвіліны — і агучанае імя было абсалютнай нечаканасцю для ўсіх прысутных. Лаўрэаткай сёлетняй стральцоўскай прэміі стала маладая паэтка з Гішпаніі Анхела Эспіноса Руіс. Да цырымоніі паэтка атрымала шыкоўны падарунак — выдадзеную Саюзам беларускіх пісьменнікаў «лаўрэацкую» кнігу выбраных твораў «Колер Крылаў», куды ўвайшлі не толькі вершы, але й эсэ, пераклады, створаныя ў апошнія гады. Нягледзячы на абсалютна нестандартнае рашэнне журы, зала вельмі цёпла прыняла й прывітала новую лаўрэатку прэміі, якая падзякавала ўсім і сказала прачулую прамову пра сваё бачанне літаратуры.

Затым былі абвешчаныя новыя лаўрэаты «Залатога апострафа». У галіне паэзіі ўзнагароду атрымаў заслужаны аксакал беларускай літаратуры паэт Васіль Зуёнак. Найлепшай празаічнай публікацыяй 2018 года была прызнаная проза Уладзіміра Сцяпана. У намінацыі «Дэбют», як адзначыў галоўны рэдактар «Дзеяслова» Барыс Пятровіч, разгарнулася найбольш вострае абмеркаванне, канкурэнцыя была вельмі вялікай. У выніку прэміяй адзначылі Марыю Бадзей. Усе пераможцы былі вельмі ўсцешаныя прэміяй і асабліва адзначалі важнасць яе ўручэння падчас Стральцоўскага фэсту, бо імя Стральцова называлася сярод найважнейшых літаратурных імёнаў у іх жыцці.

Наступны блок прадстаўляў уласна паэтычную творасць беларускіх літаратараў і замежных гасцей з Літвы, Украіны і Швецыі. Перад слухачамі выступілі мінулагоднія лаўрэаты Алесь Разанаў (Прэмія імя Наталлі Арсенневай), Бенедыктас Янушэвічус (Літва) з перакладчыцай Сюзанай Паўкштэла, Іда Ліндэ (Швецыя) з перакладчыцай Наталляй Паваляевай, Альгерд Бахарэвіч (прэмія «Кніга году»), Вера Бурлак (прэмія Шэрмана), Уладзімір Някляеў (прэмія Францішка Аляхновіча), Паўло Карабчук, Міраслаў Лаюк, Алена Сцепаненка (Украіна).

Першы дзень Стральцоўскага фэсту быў вельмі насычаным і разнаітым па змесце, і прайшоў пры поўнай зале, што засведчыла цікавасць да мерапрыемства і цікавасць да беларускай паэзіі.

Назаўтра ўсіх аматараў літаратуры прытуліў клуб «Грай» — напачатку «Мінскую школу» (з мадэратарам Дзмітрыем Строцавым), пасля чаго адбыліся прэзентацыі новых кніг Алеся Аркуша, Алеся Замкоўскага, Стася Карпава, Марыі Мартысевіч, Ірыны Ляшкевіч, Галіны Сіўчанка, Уладзіміра Сцяпана.

У аздабленні фестывалю былі музычны выступ Алеся Камоцкага і перакладчыцкі слэм. А на завяршэнні прайшла традыцыйная «Ноч паэзіі» з удзелам дзясяткаў актыўных беларускіх і замежных паэтаў.

Ул. інф.

Бярозаўская літаратурная «анамалія»

У Галерэі мастацтваў горада Бяроза адбылася знакавая падзея — адкрыццё пастаяннай літаратурнай экспазіцыі «Вытокі літаратурнага майстэрства».

Бярозаўшчына даўно славіцца літаратурнымі імёнамі. Значны ўнёсак не толькі ў нацыянальную, але і сусветную культуру зрабілі лаўрэаты нацыянальных і еўрапейскіх прэмій Алесь Разанаў і Ніна Мацяш. Нобелеўская лаўрэатка Святлана Алексіевіч напачатку сваёй журналістскай дзейнасці працавала ў раённай газеце «Маяк камунізма». Аматарам літаратуры добра вядомы імёны Раісы Баравіковай і Зінаіды Дудзюк, Віктара Супрунчука і Васіля Сахарчука, Сяргея Амельчука і Валянціны Осіпавай. На стэндах размешчаны творы і мясцовых літаратараў: Маргарыты Гаравой і Марыі Стэфанавай, Алены Усцілоўскай і іншых маладых творцаў, якія яшчэ знаходзяцца ў натхнёным палёце да сваіх вяршыняў.

Бярозаўская зямля шчодрая на таленты. Адна толькі вёска Сялец, у якой нарадзіўся Алесь Разанаў, дала беларускай культуры і драматурга Міколу Арахоўскага, і пісьменніка Віктара Супрунчука, і краязнаўца Міколу Пейгана. Вось такая бярозаўская «анамалія»! На літаратурнай экспазіцыі прадстаўлена творчая дзейнасць вядомых беларускіх журналістаў, якія нарадзіліся на Бярозаўшчыне. Сярод іх імёны Андрэя Юдчыца, які доўгі час быў рэдактарам «Народнай газеты», Анатоля Казловіча — карэспандэнта і пісьменніка-публіцыста, аўтара шматлікіх кніг і дакументальных кінастужак. Не абдзялілі ўвагай і летапісцаў роднага краю: на стэндах прадстаўлены творы Міколы Пейгана, Міколы Жуковіча, Яўгена Сялені, заслужанага дзеяча культуры БССР Міхаіла Шыманскага ды іншых мясцовых краяведаў.

На ўрачыстае адкрыццё літаратурнай выставы сабралася каля сотні гасцей. Было шмат навучэнцаў мясцовых школ. На запрашэнні земляков заўсёды шчыра адклікаецца Алесь Разанаў, які ў якасці ганаровага госця прысутнічаў на імпрэзе. Алесь Сцяпанавіч падзяліўся ўспамінамі пра пачатак сваёй творчай дзейнасці ў літаратурным аб'яднанні «Крыніца» пры раённай газеце «Маяк камунізма», падарыў музею новыя кнігі, адна з якіх створана на літоўскай мове.

Кампанію «Будзьма беларусамі!» і Саюз беларускіх пісьменнікаў на свяце творчага Слова прадстаўляла намеснік абласнога аддзялення СБП Валянціна Осіпава. Яна павіншавала ўсіх прыхільнікаў нацыянальнай культуры, якія прысутнічалі ў зале, са значнай падзеяй і ўручыла Галерэі мастацтваў памятныя сувеніры і беларускія часопісы; таксама выказала надзею, што літаратурны куток Галерэі мастацтваў стане кропкай прыцягнення для новых талентаў. Паэтка распавяла слухачам пра дзейнасць Саюза беларускіх пісьменнікаў і кампаніі «Будзьма беларусамі!» і запрасіла мясцовых аматараў паэзіі дасылаць свае творы ў літаратурны альманах Берасцейшчыны «Жырандоля», у часопіс «Дзеяслоў» і ў «новачасную» «Літаратурную Беларусь».

Госці актыўна знаёміліся з экспанатамі літаратурнай экспазіцыі, размешчанай у філіяле Бярозаўскага гісторыка-краязнаўчага музея, дзяліліся ўражаннямі, выказвалі шчырую ўдзячнасць арганізатарам літаратурнай выставы.

В. О.

Ён чытаў зоры

Жменя згадак пра Алеся Пісьмянкова

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» распачало серыю «Беларуская паэзія XX стагоддзя», аналагічная серыя і для кніг прозы. Я тады загадваў самай вялікай рэдакцыяй — Зборy твораў, выбраных твораў, перавыданняў, крытыкі і драматургіі. У перспектыўны план я ўключыў кнігу Алеся Пісьмянкова. На рэдкалегіі пачуліся галасы супраць, маўляў, зарана, малады яшчэ. Але дырэктар выдавецтва Серафім Андраюк падтрымаў: «Вы рыхтуйце. А там пaглядзім». І я пачаў рыхтаваць...

У «Мастацкай літаратуры» я адпрацаваў больш за пятнаццаць гадоў, блаславіў у друк не адну сотню кніжак. Вельмі часта даводзілася адбівацца ад настырных аўтараў, скарачаць расцягнутыя рукапісы, адбіраць вершы з таўшчэзных папак.


З Алесевай кнігай усё было наадварот: даводзілася выцягваць па вершу, аўтар лічыў многія з іх слабаватымі, маўляў, яшчэ трэба пагабляваць, падумаць. Але я не адступаў, ведаючы выключную патрабавальнасць паэта-земляка. А яшчэ ў яго была дзіўная рыса характара: шкадаваў аддаваць свае вершы ў друк. Аднойчы прызнаўся: «Мне заўсёды шкада развітвацца з уласнымі вершамі. Аддасі — яны ўжо нібыта не твае. Узнікае адчуванне нейкай пустаты. А калі яна запоўніцца, невядома».

І ўсё ж, дзякуючы маёй настойлівасці, атрымалася самавітая кніга на 320 старонак, і наклад немалы — дзве тысячы асобнікаў. А вось угаварыць Алеся памяняць загаловак «Я не памру, пакуль люблю», не ўдалося. Мабыць, у глыбіні душы ён прадчуваў свой сыход, свой лёс, сваю планіду. Адна з яго кніжак так і называлася — «Планіда». Назва выбранага — апошні радок апошняга верша з гэтай кніжкі.

Мабыць, верш падабаўся аўтару. Ён кароткі, яго варта працытаваць цалкам:

Вада. На строме сосны.
У збажыне задумны гай.
Любіць бы вечна гэты край.
Журботны.
Родны.
Росны.
Любіць высокія аблокі,
Ад гора горкую зямлю...
Любіць прызначана мне лёсам:
Я не памру,
пакуль люблю.

Можна з поўным правам сказаць, што кніга Алеся Пісьмянкова ўпрыгожыла выдавецкую серыю «Беларуская паэзія XX стагоддзя». Пра яе было шмат водгукаў і чытачоў, і крытыкаў. А я атрымаў кнігу з аўтографам: «Дарагому Леаніду Кірэевічу Левановічу — майму таленавітаму земляку і спагаднаму рэдактару з заўсёднай павагай. 13 сакавіка 2001 г.»


Фота www.rv-blr.com

Неяк вясною, на Радаўніцу, мы з Алесем выбраліся на радзіму — пакланіцца магілам продкаў. Па дарозе завіталі ў Лапічы, вялікае мястэчка ля Бабруйска, дзе працаваў дырэктарам школы малодшы Алесеў брат Мікалай. Ехалі мы на маім «жыгулёнку». Браты сцішана гаманілі пра жыццё-быццё, пра палітыку, пра літаратуру і неўзабаве пачалі спрачацца. Басавіты Алесеў голас загучаў мацней, але ў ім адчувалася прыхаваная паблажлівасць, маўляў, хоць ты і дырэктар школы, а ў палітыцы, тым больш — у літаратуры, не разбіраешся.

Пасля Магілёва спыніліся на перакус. Браты кульнулі па кілішку за сустрэчу, а я мусіў піць адно гарбату. Паехалі далей. Браты зноў усчалі спрэчку. «Вось ты расхвальваеш Барыса Пастарнака, а я «Доктара Жываго» ледзьве дачытаў. Прымушаў сябе», — гарачыўся Мікалай. «Пастарнак — вялікі талент. Ён не вінаваты, што ты лянуешся чытаць». — «Каб ты ведаў, колькі ў мяне клопатаў», — уздыхнуў дырэктар вясковай школы.

Я прывёз братоў у Бялынкавічы, увайшлі ў хату. Узрадаваная Марыя Сямёнаўна, маці братоў, кінулася накрываць на стол. Запрасіла мяне на пачэснае месца, але я адмовіўся: мяне чакала ў Касцюковічах старэйшая сястра Моця. З Алесем дамовіліся, што праз дзень я прыеду да яго.

Слова сваё я стрымаў, назаўтра пасля Радаўніцы прыкаціў у Бялынкавічы.

— Добра, што вы прыехалі, — узрадаваўся Алесь. — Пасля Радаўніцы заўсёды журботна на душы. Брат учора аўтобусам паехаў у Лапічы... Пойдзем на Бесядзь. Зараз пад'едзе Міхаіл Шаванда. Гэта — галоўны лясніцы лясгаса. Цікавы чалавек. Адданы лесу. Спрабуе пісаць прозу...

Неўзабаве мы ўтрох сядзелі на высокім беразе ракі. Расклалі цяпельца, у казане варылася юшка — лясны начальнік пятарабаніў шчупакоў і акунёў. Міхаіл Іванавіч Шаванда насамрэч зацікавіў мяне. Каржакаваты, рухавы, з абветраным, загарэлым тварам, на якім свяціліся розумам і досціпам валошкавыя вочы. Родам ён з суседняга раёна, ад звычайнага лесніка дарос да галоўнага ляснічага. Пра сябе, пра лясныя клопаты распавядаў нетаропка, не забываючы падкідваць у агонь сухія паленцы, якія прывёз з сабою.

Дзень быў сонечны, ветраны, такія дні часта надараюцца напрыканцы красавіка. Трохі воддаль стаяў белы, нібы абліты малаком, чаромхавы куст, дзесьці далей цёхкаў салоўка. Юшка неўзабаве зварылася. Пад яе кульнулі мы па кілішку — памянулі нашых продкаў.

— Алесь, мы з табой даўно не бачыліся. І вершаў тваіх даўно не чуў. Пачытай што-небудзь. З новых... — папрасіў Шаванда.

Алесь адкашляўся, быццам нешта пяршыла ў горле, і густым барытонам пачаў:

Калі марнею ад нягод
І сэрцу цесна,
Я ўспамінаю радавод
І продкаў песні...

Ён чытаў пра Вашчылу, пра Сож, пра бяроз дзявоцкую цнатлівасць і соснаў бронзавы загар, пра неба чыстае без хмар. І што мяне асабліва ўразіла — пра зоры. Я ведаў, што ў Алеся нядаўна выйшла кніжка «Чытаю зоры».

«Я хацеў дастаць з неба зорку і апёк сабе рукі...» — гучаў басавіты голас паэта. Яшчэ раз паўтаруся: слухаць, як Пісьмянкоў чытаў свае вершы, была вялікая асалода. А яшчэ падумалася: ён чытае зоры, каб зразумець свой радавод, нашы карані, гісторыю краіны. Я пазіраў на Алеся збоку і злавіў сябе на думцы: ён падобны да Байрана... Прачытаў Алесь і «Оду бярозаваму веніку». Расчулены Шаванда падняўся, абняў паэта.

Паэт, народжаны ў прыгожым краі, павінен паказаць людзям ягоную прыгажосць і хараство, так бы мовіць, сплаціць свой доўг. Хораша сказаў пра гэта яшчэ ў 1913 годзе ў «Нашай Ніве» мудры Вацлаў Ластоўскі: «Паэта павінен быць вучыцелем і пракорам свайго народа

— Ну, Алесь, дарагі ты мой... Я не крытык. Я — лесавод. Але мне здаецца, гэты верш — маленькі шэдэўр. Як вы, Кірэевіч, згодны?

— Цалкам згодны. Ваша думка — гэта голас народа. «Оду...» я ведаю на памяць.

Не я першы выкажу думку, што літаратар, асабліва паэт, павінен нарадзіцца ў прыгожым краі. Вось як пра гэта піша Алесь у эсэ «Пісьмянкоў Луг». Хай даруе мне чытач, але вынятка будзе даволі доўгая:

«Можа, я і пішу нешта сваё толькі таму, што ў мяне былі і ёсць Белы Камень і Мізырычы на Зубары, Бялынкавічы на Бесядзі, Канічы на Сураве... Нездарма ж сам Аркадзь Смоліч заўважыў у сваёй славутай «Геаграфіі Беларусі», што Касцюкоўшчына «ляжыць над Бесяддзю ў прыгожай мясцовасці». Можа, дзякуючы акурат гэтай прыгажосці тут і з'явіліся на свет пісьменнікі Якуб Брайцаў, Аркадзь Куляшоў, Іван Чыгрынаў, Аляксей Русецкі, Масей Сяднёў, Васіль Хомчанка, Пятро Прыходзька. Леанід Левановіч, Сямён Пацёмкін, Віктар Патапенка, Міхась Губернатараў, Мікола Мельнікаў, выдатны мастак Антон Бархаткоў».

Тут трэба патлумачыць: назву Пісьмянкоў Луг людзі далі мясцовасці, якую расчысцілі, зраўнялі, высеклі хмызняк над Зубарам і ператварылі ў прыгожы раздольны луг працавітыя Алесевы бацькі.

Уранні, пасля паходу ў грыбы, Алесь прыткнуўся да стала на верандзе. Праз нейкі час падаў мне аркуш з нататніка, спісаны акуратным, прыгожым почыркам. «Гэта вам на ўспамін». Верш называўся «Пятрылава». Прыказку «Чакай Пятра — сыр з'ясі» аўтар узяў эпіграфам. Верш кароткі, лапідарны, як і ўсе творы Пісьмянкова: у іх няма ніводнага лішняга слова, таму цытую яго цалкам:

Певень залопаў крыламі,
Лясныя будзячы нетры.
Рана ўстае Пятрылава:
Пятрылаву трэба петрыць:

Петрыць і рупіцца шчыра.
За косы і граблі пара:
Нельга застацца без сыру
Пятрылаўцу да Пятра.

Вось так лясная вёсачка-шасціхатка Пятрылава ўвайшла ў літаратуру: твор пра яе надрукаваны ў кнізе «Думаць вершы». Раз ужо я ўзгадаў гэтую кніжку, а ўбачыла яна свет у 2005 годзе пасля заўчаснай смерці паэта, у ёй ёсць верш «Зямная аснова», прысвечаны мне. Верш таксама кароткі, лапідарны.

Зямная аснова
Трывалай была.
Прыручана слова.
Раіцца пчала.
Такая планіда
Ў майго земляка.
Пяро Леаніда
Натхняе рака.
Нішто не замуціць
У Бесядзі дно.
На ёй каламуці
Дасюль не відно.
Хоць свет і суровы,
Стае ў ім святла.
Прыручана слова.
Раіцца пчала.

Час ляціць хутка. Вось ужо пятнаццаць гадоў прамінула, як Алесева душа ўзляцела ў неба, да зор, якія паэт любіў чытаць. Ён цвёрда стаяў на Зямлі, любіў свой родны кут, сваю Бесядзь, але вельмі часта пазіраў у неба, мабыць, як ніхто з нашых творцаў. Вось гэткага нябесна-касмічнага падыходу да жыцця бракуе нашай літаратуры. Даволі рэдка героі нашых кніг углядаюцца ў неба і шукаюць сваю Зорку, як гэта рабіў на пачатку XX стагоддзя геніяльны юнак Максім Багдановіч. А ўслед за ім і Алесь Пісьмянкоў.

Паэт, народжаны ў прыгожым краі, павінен паказаць людзям ягоную прыгажосць і хараство, так бы мовіць, сплаціць свой доўг. Хораша сказаў пра гэта яшчэ ў 1913 годзе ў «Нашай Ніве» мудры Вацлаў Ластоўскі: «Паэта павінен быць вучыцелем і пракорам свайго народа, павінен быць суддзёй і цветам душы яго, павінен выяўляць красу свайго народа і краю». Алесь Пісьмянкоў гэта разумеў. Ён шмат вершаў прысвяціў сваім Бялынкавічам і Беламу Каменю, роднай Бесядзі і Зубару, пісаў пра кіраўніка паўстання Васіля Вашчылу і сваіх мужных працавітых продкаў. Ёсць у яго глыбока філасофскі верш, у якім паэт, наш сучаснік, выказвае сваё разуменне жыцця, часовасці чалавека, непазбежнасць адыходу ў вечнасць: мы станем «Зямлёй, травой, кустамі, І будзе дождж ісці над намі, І будзе снег ісці над намі, І будуць воблакі над намі. І будуць зоркі спець над намі. Як над зямлёй, як над травой, як над кустамі...»

Пра творчасць Алеся Пісьмянкова, пра яго як Чалавека, як Асобу напісана нямала. У пасмяротнай кніжцы «Думаць вершы» пра яго згадваюць зямляк і блізкі сябар Віктар Патапенка, калегі-літаратары Анатоль Зэкаў, Алесь Марціновіч, Навум Гальпяровіч, Таццяна Мушынская, Уладзімір Ягоўдзік ды іншыя. Не магу не адзначыць таленавітую кнігу Віктара Патапенкі «Шлях бярозамі значаны», якая прысвечана жыццю і творчасці нашага паэта-земляка. У цёплай прадмове яе высока ацаніў Анатоль Зэкаў. Піша В. Патапенка пра сям'ю паэта: жонку Алену, сыноў Максіма і Аляксея.

Мне думаецца, што творчасць Алеся Пісьмянкова яшчэ чакае свайго прачытання, бо ягоная паэзія, так бы мовіць, яшчэ расце. Маю думку пацвярджае выдатны паэт Алесь Разанаў: у часопісе «Дзеяслоў» (№ 2, 2016) ён надрукаваў грунтоўнае даследаванне «Зацемкі з зімовага саду», у якім аналізуе верш «Мой сад у снезе па калена». Аўтар піша: «...верш просты і нават празрысты, усё ў ім для слыху і разумення вядомае, аднак у яго простасці і празрыстасці ёсць нешта тое, што затрымлівае ўвагу, што надае вершу глыбіню...» І гэтай глыбіні Разанаву хапіла на дванаццаць (!) часопісных старонак. Унікальнае даследаванне! Прачытаўшы яго, міжволі падумалася: беларуская літаратура мае права ганарыцца паэтам-мысляром Алесем Пісьмянковым і паэтам-інтэлектуалам Алесем Разанавым.

Дарэчы, артыкул яго публікуецца пад рубрыкай «Прачытанне». Значыць, насамрэч вывучэнне спадчыны Алеся Пісьмянкова, паэта, які чытаў зоры і які знічкаю дачасна ўзляцеў у нябёсы, яшчэ наперадзе.

Леанід Левановіч

Янкоўскі

Словы пра мовазнаўцу



Адам ГЛОБУС

Пераклады

Вядомы ў Беларусі філолаг Фёдар Янкоўскі ў кнізе «Само слова гаворыць» выказаўся пра пераклад і перакладчыка: «Каб перакладаць, трэба ведаць хоць бы... дзве мовы, а калі на сталe ляжаць падрадкоўнікі — трэба ведаць (засмяешся, чытатач?) хоць бы... адну мову. Тую, на якую перакладаеш». Філолаг меў рацыю. Перакладчык мусіць ведаць мову, з якой працуе. Мая знаёмая перакладчыца Вера Маркава перакладала творы старажытнай японскай літаратуры не проста на рускую мову, яна іх перакладала на рускую мову Льва Талстога, на мову ягонага самага лірычнага твора «Дзяцінства, малалецтва, юнацтва». Маркава зрабіла такія выдатныя тэксты, што яе пачалі называць «вялікая руская перакладчыца». Дзякуючы яе перакладам у рускай літаратуры з'явіліся новыя паэтычныя жанры — хоку і танка. Ніхто з беларускіх літаратараў яшчэ не заслужыў ганаровага звання — геніяльны перакладчык. Прынамсі, мы яшчэ не казалі пра гэта публічна. Спадзяюся, што ў нас абавязкова з'явяцца вялікія перакладчыкі, і ў нейкай ступені, гэта адбудзецца дзякуючы такім майстрам слова, як Фёдар Янкоўскі.

«Ты»

У кнізе Фёдара Янкоўскага «Абразкі» ёсць замалёўка «У гасцях», дзе можна прачытаць: «А на другі дзень маці не ўтрывала:

— Як жа гэта? Дзе ж бачылі?! Ні ў нашай, ні ў суседніх вёсках няма і не было гэтакага. Ра́дачка мая! Дзеці на бацькоў — на бацьку, на матку — «ты»! А тады і на мяне, старую, на бабулю, ужо «тыкаюць». Гэта ўнукаў прычакала...»

Тое самае было і ў маіх вёсках ды мястэчках. Мае бацькі да сваіх татуль ды матуль звярталіся толькі на «вы». Адпаведна і я да бабы з дзедам звяртаўся на «вы». Праўда да таты і маці ўжо па-сталічнаму на «ты», але я ніколі не мог звярнуцца да бацькі ці да маці праз імя. Сказаць да таты «Чэсь» ці паклікаць маці: «Ніна!», мне і ў галаву не прыходзіла. Нават тады, калі я пачуў, як мой сусед — пяцігадовы Максім — называе сваю маці Мая. І ягоная сястра Ніка звярталася да маці на «ты» і магла сказаць ёй нібыта якой сяброўцы ці раўналетцы: «Мая, ты чула?»

Шчыра кажучы, мяне такая фамільярнасць крыху бянтэжыла. Зразумела, што я ніколі не рабіў ніякіх заўваг ні Максіму, ні ягонай Ніцы. Проста, у іх сям'і было крыху па-іншаму, чым у нашай. Узрушанасці і абуранасці, пра якую напісаў Янкоўскі, я ніколі не чуў, адно чытаў. Свет змяняецца досыць хутка, было так, а цяпер інакш, але гэта не азначае, што інакш абавязкова горш, бо цеплыні ў адносінах Максіма з маці было не менш, чым у тых, хто звяртаўся да сваіх мамусі і татусі выключна на «вы».



Янка Брыль (злева) і Фёдар Янкоўскі

Сцебурака

Каб стаць паэтам, трэба напісаць два вершы, бо ў кожнага, хто спрабуе вершаваць, адзін твор абавязкова атрымаецца, а другі без таленту не складзецца. Калі я прачытаў у развагах паэта Сікі, што непараўнальны Басё мае толькі дзесяць выдатных вершаў, я ледзь не абурыўся. Чаму так мала? А потым зразумеў і прыняў словы Сікі, бо каб стаць непераўзыдзеным паэтам Японіі дзесяць геніяльных хоку больш чым дастаткова. Таму я паважаю анталогіі, складзеныя так, што аднаго паэта прадстаўляе адзін найлепшы верш. Асаблівую радасць я адчуваю, калі ў газетнай падборцы ці сярод інтэрнэтных постынгаў знаходжу добры верш з новай і маладой паэзіі. Так на старонцы «Нашай Нівы» я прачытаў «Ранішні блюз» Усевалада Сцебуракі.

Ранішні блюз

У пяць гадзін раніцы, ў пяць
таксоўкі самотна стаяць,
месяцічы ўсе яшчэ сьпяць
у пяць гадзін раніцы, ў пяць.

У пяць гадзін раніцы, ў пяць
шклом алкашы не зьвіняць,
дзеці «Макдональдсы» сьняць
у пяць гадзін раніцы, ў пяць.

Хтосьці на працу ідзе,
хтосьці ідзе ваяваць,
хтосьці плыве па вадзе,
хтосьці працягвае спаць...

У пяць гадзін раніцы, ў пяць
сонна ліхтарні гараць,
рана судзіць і караць
у пяць гадзін раніцы, ў пяць.

У пяць гадзін раніцы, ў пяць
можна сабе дазваляць
простыя рыфмы ствараць
у пяць гадзін раніцы, ў пяць.

Хтосьці на працу ідзе,
хтосьці ідзе ваяваць,
хтосьці нявeдама дзе
толькі зьбіраецца спаць.

Выдатны верш. Таму і чакаў я кнігу Сцебуракі, таму і шукаў у той кнізе другі таленавіты верш, каб сказаць усім, што Усевалад — паэт. Толькі другога добрага верша ў кнізе «Крушня» не знайшлося. І мог бы я не пісаць свае развагі пра два абавязковыя вершы для паэта, каб не згадка пра фалькларыста Фёдара Янкоўскага. Пасля публікацыі адной з першых маіх вершаваных падборак я атрымаў ліст ад вядомага збіральніка фальклору. Ён хваліў мае творы, расказваў пра сваю радасць ад знаёмства з маёй паэзіяй. Таму і я пішу пра «Ранішні блюз», бо ўсё яшчэ спадзяюся прачытаць другі таленавіты твор Усевалада .

Бацька

Да свайго бацькі я зазвычай звяртаўся праз слова «тата». Ён у нас быў «татам», бо слова «бацька» ў нашай сям'і зніто́ўвалася з дзедам Уладзімірам. Баба Броня казала пра яго «наш бацька». Каб не блытацца, я на свайго бацьку казаў «мой тата».

У абразку Фёдара Янкоўскага «Бацька» прачытаў: «Калі я бачу партрэт Францішка Багушэвіча ці чую гэтае імя, побач устае вобраз бацькі. І наадварот. У абодвух былі амаль такія самыя вусы. Абодва хударлявыя, энергічныя, няўрымслівыя і, здаецца, нястомныя. Абодва дарагія мне. Адзін — родны бацька, другі — той, хто, як ніхто да яго, сказаў свету пра Беларусь і беларусаў...»

Цікава, што і для мяне вобраз Багушэвіча заўжды быў звязаны са словам «бацька», бо менавіта ён — бацька новай беларускай літаратуры. Дарэчы, і наш дзед Уладзімір Фёдаравіч Адамчык быў крыху падобны тварам да Багушэвіча, хоць заўжды галіў бараду і вусы не насіў.

Чысцец

Кастусь КАЛЮЧЫ

У ярка асвечаным сонцам пакоі я стаю разам з некалькімі хлопцамі. Сцены — бруднага блакітнага колеру. Перад вакном — шырокі стол, за якім з сур'ёзным выглядам сядзяць людзі ў белых халатах. Мой позірк мільгануў па дзяўчыне, што сядзіць на крайнім крэсле. Хударлявая, з невялікімі прыгожымі грудзямі. Яе халат зашпілены на ўсе гузікі, якія, схаваўшы пад беласнежнай тканінай таямніцу сусвету, усё ж нараджаюць жаданне спрычыніцца да яе раскрыцця. Але сёння надзеі і мары прысутных звязаны зусім з іншым.

Я пераводжу позірк на лысаватага дзядзечку. Мы ўсведамляем, што праз некалькі гадзін ягоныя словы вырашаць наш будучы лёс. Калі на нябёсах ёсць чысцец, дык напэўна ён выглядае менавіта так. Праўда, ёсць адна перавага: рашэнне аб тым, куды цябе адправяць — у рай ці ў пекла — будзе прымацца не ў залежнасці ад таго, наколькі грэшным ты быў дагэтуль. Невядома толькі: перад нябесным кансіліумам таксама паўстаеш у сваім самым натуральным безабаронным абліччы? Пад пільным позіркам экспертаў мы стаім цалкам аголены...

Чую сваё прозвішча. Вагаюся, абдумваючы, як правільна адказаць — «я» ці «ёсць» — і моўчкі раблю некалькі крокаў наперад...

***

Колькі гадоў таму, калі я дагрызаў у старэйшых класах апошнія кавалкі навуковага граніту, мне ўпершыню выпала магчымасць пазнаёміцца з абласнымі спецыялістамі. Мясцовыя дактары не маглі знайсці прычыну маёй немачы і накіравалі ў горад на Віцьбе. Дыягнастычны цэнтр з дапамогай прасунутай тэхнікі пацвердзіў адсутнасць у маім целе пэўных анамалій. Пасля агучвання вынікаў дасследавання доктар запытала: «Я так разумею, у вас хутка будзе медкамісія пры ваенкамаце?». Разумець гэтыя словы трэба было так: «Спрабуеш касіць?»

Зладжаная ўжо ваенкаматам вандроўка ў Віцебск выдалася незабыўнай. Каму хоць аднойчы ка́палі ў вочы атрапін, зразумеюць, як выглядалі і што адчувалі два студэнты (са мной быў яшчэ мой аднагрупнік) сонечным зімовым днём. Для тых, хто не ў тэме, патлумачу: калі бачыце маладзёна, які няўпэўнена сунецца, скіраваўшы позірк долу, абліваецца слязьмі і хваравіта жмурыцца, нават калі сонца хаваецца за хмарамі, не спяшайцеся лічыць яго наркотам ці вар'ятам. Ёсць верагоднасць, што ягоныя зрэнкі памерам з капейку не рэагуюць на святло праз дзеянне атрапіну, які закапалі яму перад накіраваннем да спецыялістаў, у якіх табліца «ШБ мнк» нейкім сакрэтным чынам адрозніваецца ад той, якой карыстаюцца мясцовыя вочнікі.

Але галоўная паездка была потым. Выявілася, што хвароба скуры, якую ў мяне выявілі, вызваляе ад неабходнасці на паўтары гады абувацца ў кірзачы. Заставалася толькі, каб дыягназ пацвердзіла воблась.

Тамтэйшы скурвендыспансер нагадваў адначасова папраўчую ўстанову і вар'ятню. Пераступіўшы парог, я зазнаў тыя ж пачуцці, што і оруэлаўскі Ўінстан Сміт у Міністэрстве Любові.

У палаце было тры чалавекі: два дзядулі і хлапец, які таксама патрапіў сюды «па лініі ваенкамата». На мяне адразу кінуў цікаўны позірк хлопчык гадоў васьмі. Чыйсьці ўнук, падумаў я. Буркнуўшы «Усім дзень добры», рушыў да свайго ложка. У гэты момант малы скочыў з ложка і кінуўся да мяне. Працягнуў рукі і... паспрабаваў злёту мяне абняць. Не чакаўшы такой раптоўнай шчырасці і ўсмешкі ў месцы, дзе нават рукацца ні з кім не хацелася, я зрабіў нязграбнае падабенства абдымкаў — выцягнутымі рукамі пацісну́ў хлопчыка за плечы.

— Ваня, не прыставай да людзей! — жартаўліва сказала медсястра, што была ў палаце. Ваня пасміхнуўся і падышоў да майго суседа, відаць, каб працягнуць размову, якую перарвала маё з'яўленне.

Ваня не быў нічыім унукам. Ён быў сіратой і трапіў сюды з нейкай балячкай на галаве. У адрозненне ад большасці пацыентаў, ён быў бязмежна рады змене свайго месцазнаходжання і новым людзям, таму і заходзіў цягам дня ў чужыя палаты. Пастрыжаны «пад нуль», у клятчастай старой кашулі, ён быў падобны на ахвяру вайны. Ахвяру, якая яшчэ не ўсведамляе свайго незайздроснага лёсу і таму яшчэ дзеліцца з гэтым светам сваім пазітывам.

Харчаванне было стандартным для такога кшталту ўстаноў: аўсянка, батон, гарбата... Дадатковую цяжкасць з ужываннем ежы выклікала суседства з хворых. Наглядзеўшыся на ўсё і ўсіх, употай суцяшаў сябе, што я тут не на лячэнні і мяне трымаць доўга не будуць.

Вечарам, лежачы на ложку, ніяк не мог заснуць. І каб знайсці штосьці прыемнае ў сваім становішчы, думаў пра сваю сяброўку. Віцебск — горад нявест. Супадзенне ці не, але сяброў у гэтым горадзе ў мяне ніколі не было, толькі сяброўкі. З прыгажуняй Аленай, якую ведаў крыху болей за год, кантактаваў «на адлегласці», але калі лёс рабіў адлегласць паміж намі карацей за кіламетраж паміж Полацкам і Віцебскам, яна дзіўным чынам апыналася побач са мною. Калі дзяўчына даведалася, куды закінуў мяне чарговым разам няўдзячны лёс, — дык адразу, хоць я і адгаворваў, паведаміла, што прыедзе за мной.

***

Калі ўсё скончылася, я пашыбаваў як мага хутчэй да выхаду з будынка. Да неадольнага жадання памыцца дадалося памкненне спаліць сваю вопратку.

Свежае паветра дыхнула ў твар, і ад дзённага вулічнага святла на імгненне заплюшчыў вочы. Потым я ўбачыў яе. Лёгкі ветрык гуляў даўгімі светлымі валасамі. Той, хто лічыць анёлаў бясполымі стварэннямі, памыляецца, — анёл быў перада мной у спадніцы і на абцасах. Зрэшты, у кожнага свае анёлы.

Я наблізіўся да Алены, і яна спытала: «У цябе ўсё добра?» У душы яшчэ не сціх гармідар эмоцый і думак, і мне нешта яшчэ замінала супакоіцца. Я пагладзіў на свайго анёла, потым на шэры будынак. «Пачакай хвіліну», — прамовіў я і накіраваўся назад да дзвярэй...

Маладая вясна

Валянціна АКСАК

Прыступкі да яблыні Евы

У нейкім нарвежскім кіно
пра аматарак кветак
было пра старую кабету,
якая штодня
апаноўвае дбаць
пра сто ружаў
у садзе нагорным.
Прыступкі ў яе
да ружоўнікаў
там уладкованы
для звыш загартованых пані,
бо да кожнага кусціка
трэба мо метар які
ўверх уздымацца.
Удзячныя кветкі штодня
ля самай
высокае клумбы
выстаўляюць ёй
келіх бургундскага.
Ну чым не матыў,
каб моцна любіць
і іншых
на гэтым шляху.
А Ева пры чым?
Яна — толькі прытча.
Тым болей,
што яблыка
і не было.

Крылы

Успаміны
мокрымі крыламі
валочацца ўсцяж
слізкае сцежкі,
не даюць
вырвацца ў вырай
услед за буслямі,
жаравам наўздагон.
Але як тужліва
курлычуць тыя,
што ўзняліся
на Птушыны Шлях.
Яны зайздросцяць
мне,
прыледзянелай
да свайго
пагорку.

Воддаль

Божа,
якое гэта шчасце —
сядзець пад зорамі
і ні пра што
не думаць!
Зрэшты,
мой Божа,
я ўсё ж думаю —
пра Цябе
і зоры.

Побач

Побач
з прыгожаю жанчынай
хочацца
яшчэ больш згорбіцца,
зашыцца ў норку
і ніколі
адтуль
не вылазіць.

Ніцма

Захутанаю
ў сынавыя апранахі
між дзьвюх бярэзінаў
мне шчасце легчы
ніцма.

Аблічча ў небе

Колькі гляджу на неба,
столькі знаходжу воблакаў
з абліччам бацькі
ў труне.

Мінулае мінула

Мінулае — гэта бацькí.
Яго закапалі ў іхніх магілах.
Цяпер у мяне — толькі зараз.

Выпадаю

Выпадаю з нагоды,
з прыгоды, з пагоды.
Выпадаю з раскладу,
з параду, з прынады.
Выпадаю з датклівых,
тактоўных і тонкастанных.
Выпадаю з душэўных,
духоўных і душадайных.
Выпадаю з чужых
і з сваіх,
і з аніякіх.
Выпадаю са слова.
Хутка выпаду з мовы.
Ані гуку.
Ні згадкі.
Ціша.
Цемень.
І чуйная знічка
ў чорным акне.

Там, дзе цвітуць асфадэлі

Такое сухое слова —
аж но трашчыць на вуснах,
якіх у мяне ўжо няма,
няма чым адчуць
іхнюю райскую слодыч,
падзівіцца
на бялюткія
з чырвонымі кропачкамі
вяночкі
таксама не магу.
Выпетрала цела —
душа ацалела,
ценем блукае ў палях
невідочнай красы. Учора сустрэлася
з цярплівіцай Пенелопай.
Алены ў гэтых пейзажах
нешта не бачна —
прыўкрасная фанабэрыня,
пэўна, пасланая
ў пекла.
Шкода яе,
дурніцу.



Фота www.kripalu.org

Бабуля мая дарагая

У той год, калі ты,
мая мілая,
нарадзілася,
Расея прызнала
грыгарыянскі каляндар,
так што з запісам у дакуменце
ў тваіх пашанотных бацькоў
не ўзнікла ніякіх праблемаў,
а дзецям і ўнукам тваім
потым
не давялося галаў ламаць,
калі ж адорваць цябе
аблямованым белым
пурпур першацветаў.

Праўда,
бацькі духавенства рашылі,
што дэкрэт бальшавіцкі
ім не ўказ,
і Вялікдзень спраўляць давялося,
як некалі, двойчы:
31 сакавіка
ў засценку ў бабулі з мамуляй
і 5 траўня
дома ў Менску,
з татулем тваім і татулем ягоным.
Але за ўсе сто
тваіх жыццядайных гадоў
было 28 нябесных праяваў,
калі зоркі шчасліва злучаліся
і ў кошыку для свянцонага
маміны пісанкі
прытуляліся любасна
да бацькавых фарбаванак.
Адзіны ж разок
было нават так,
што ў дзень твой
святар хваласпевам абвесціў
пра Ўваскрэслага з мёртвых.
Свяцілы нябесныя сыдуцца так
шчэ як мінімум тройчы
на наступным тваім
векавечным шляху,
да якога,
дай Божа,
дажыць.

Але вернемся крыху ізноў
у першы твой год.
Тады ж акурат
запяяў на ўвесь свет
Сымонка малы,
скрыпка ягоная
рвала ўсім сэрцы,
узбунтоўвала душы,
загрувашчвала розум
грахоўнымі думкамі.
Мо таму
яго й выгналі з дому,
каб спакойна народ дагледаў
сваю рунь і скаціну
і не пнуўся нічога мяняць.
Граблі, косы, снапы —
вось багі,
якім трэба маліцца
і дзяржаўнаю мэтаю мець,
пра што нават
і герб сакавіцкі засведчыў.
Потым нехта з тых радных
усё ж дакумэкаў
пра сымбаль спрадвечны
і рыштунак мазольнае працы
з герба прыбраў.
Ваяра верхаконнага
сталі мы мець
за галоўны сымболь.
Рыцару тому, аднак,
не ўдалося да мэты дапяць.
Разбойная новая ўлада
спутала косю,
пацягнула на бойню,
а вершніка кінула за муры.

Дзіцячая памяць схавала надзейна
вопратку тых дзён веснавых,
не выпетрыў мрояў аб волі
ні рыжскі раздрай,
ані дулы наганаў
на галгофах
ад краю да краю,
ні падступныя слодычы
юдавых пацалункаў
вуснамі набрыдзі
ўсякіх масцей.

Ты таемна
пабралася шлюбам,
дзетак харошых займела.
Яны выраслі
і нарадзілі мяне
і многіх маіх
сястрычак і брацікаў.
Мы ў сілу ўбіраліся,
моўчкі ў душах пястуючы
спеў пра цябе.
Але гімн твой
прарваўся навонкі
разам з крыкам радзінным
нашых сыноў і дачок,
і мільённае рэха
панесла па свеце
неразвоны літаўраў.
Ты чуеш,
як граюць нашчадкі твае!
І шчаслівая,
праўда ж,
сустрэць разам з намі
гэтае вечнае сонца
і гэты бяскрайні
нябескі блакіт,
і прывітаць тваіх праўнукаў,
якіх нарасло гэтак шмат,
што для злыдняў зусім
тут
не стала прытулку
і не будзе ніколі.
Ведай гэта!
І спакойна святкуй.
Чаркніся з намі ўсімі
за волю
і тваю маладую вясну!

Бабуля мая дарагая,
Бэнэзраўка любая!
Жыві вечна, як Бог!

25.03.2018

Беларусь у 1812 годзе



Уладзімір АРЛОЎ

У 1812 годзе французскі імператар Напалеон пачаў вайну з царом Аляксандрам I. Расейскія гісторыкі называюць тую вайну Айчыннай, гэта значыць такой, калі, баронячы Радзіму, супроць захопнікаў падымаецца ўвесь народ. Але для Беларусі вайна 1812 года была зусім інакшай. Нашыя продкі не лічылі Расейскую імперыю Айчынай і не хацелі бараніць яе. Пазбавіўшы ліцьвінаў-беларусаў незалежнасці, царская ўлада ператварыла Беларусь у сваю калонію. Жыхары Літвы-Беларусі спадзяваліся, што Напалеон вызваліць іх з цяжкага прыгнёту і дапаможа адрадзіць Вялікае Княства Літоўскае.

15 тысяч рэкрутаў за год

Напалеон Банапарт, якога ў 1804 годзе абвясцілі французскім імператарам, быў выдатным палкаводцам. Ён атрымаў мноства бліскучых перамог і здолеў усталяваць уладу амаль над усёй Еўропай. Расея не магла змірыцца з тым, што Францыя робіцца галоўнай дзяржавай на еўрапейскім кантыненце, і рыхтавалася да вайны. Галоўны цяжар падрыхтоўкі, як заўсёды, клаўся на паняволеныя народы.

На абшары колішняга Вялікага Княства Літоўскага стаялі дзве царскія арміі колькасцю 157 тысяч салдат і афіцэраў. Беларусы мусілі забяспечваць іх правіянтам. У артылерыю забіралі найлепшых коней. Нашмат павялічылі набор рэкрутаў, якім было наканавана служыць цару 25 гадоў. Амаль ніхто з іх не меў шанцаў вярнуцца дадому жывым. За адзін толькі перадваенны 1811 год у беларускіх губернях забралі ў расейскае войска 15 тысяч маладых беларусаў. А наогул рэкруты з нашых земляў складалі тады пятую частку ў царскім войску, хоць на абшары Беларусі жыло ўсяго восем працэнтаў насельніцтва Расейскай імперыі.

Расея рыхтавалася нанесці першы ўдар, але Напалеон апярэдзіў Аляксандра I…

Армія французскага імператара

Для паходу на Расею французскі імператар падрыхтаваў велізарнае 600-тысячнае войска. Напалеон называў гэтую збройную сілу Вялікай арміяй.

Войска лічылася французскім, але французаў у ім было меней за палову. Астатнія жаўнеры і афіцэры паходзілі з Аўстрыі, Прусіі, Галандыі, Швейцарыі… Вялікая армія размаўляла на двух дзясятках моваў. Пад сцягі Напалеона стала шмат італьянцаў і палякаў. Італьянцы марылі пра адзінства і незалежнасць раздробленай Італіі. Сваю дзяржаву ў ранейшых межах спадзяваліся з дапамогаю французскага імператара адрадзіць і палякі.

У Вялікай арміі служылі тысячы беларусаў-ліцьвінаў, што апынуліся за мяжой пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай і задушэння вызвольнага паўстання на чале з Тадэвушам Касцюшкам і Якубам Ясінскім. Нашых суайчыннікаў вяла вера ў аднаўленне незалежнасці Вялікага Княства.

Чакалі і шляхта, і сяляне

На нашых землях напалеонаўскія войскі ўжо даўно з надзеяй чакала большасць насельніцтва. Шляхта збірала грошы для французаў, што трапілі ў расейскі палон у 1807 годзе. Сяляне верылі выдадзеным па-беларуску ўлёткам з абяцаннем скасаваць прыгон, якія пашыралі прыхільнікі Напалеона. Каталіцкае і вуніяцкае духавенства разлічвала пазбыцца ўведзеных расейцамі шматлікіх абмежаванняў.

З перахопленых лістоў, а таксама з данясенняў віжоў-шпегаў расейскія ўлады часта даведваліся пра намеры шляхты і месцічаў служыць у Вялікай арміі. Гэтых «врагов государя и Отечества» арыштоўвалі і судзілі. Іх маглі чакаць смяротная кара або пажыццёвая служба ў царскім войску. Адзін з такіх асуджаных шляхціч Адам Чарноцкі мусіў цягнуць салдацкую лямку ў Бабруйску. Ён здолеў збегчы ды перайсці мяжу і ўступіў у корпус французскага маршала Даву. Чарноцкі перадаў свайму камандзіру план важных расейскіх умацаванняў — Бабруйскай фартэцы.

Яшчэ за тры гады да паходу на Расею палкоўнік Тадэвуш Тышкевіч, што служыў у войсках Напалеона Банапарта, пісаў яму ў рапарце: «У маёй краіне ад Нёмана да Дзвіны сэрцы людзей адкрытыя да Вас».

«Слава вызваленцам!»

У купальскую ноч 1812 года Вялікая армія пераправілася цераз Нёман, па якім тады праходзіла мяжа Расейскай імперыі.

Праз чатыры дні Напалеон ужо ехаў па вуліцах Вільні. Сталіца Айчыны нашых продкаў сустракала французскага імператара як героя. Горад грымеў воклічамі «Слава вызваленцам!» Шляхцянкі кідалі пад ногі Банапарту, ягоным генералам і афіцэрам букеты кветак. Ліцвінская арыстакратыя ладзіла ў гонар вызваленцаў багатыя пачосткі ды балі.

Першым пад бел-чырвона-белымі сцягамі ў горад увайшоў беларускі кавалерыйскі полк князя Дамініка Радзівіла. Шмат ліцьвінаў ваявала і ў палках польскага генерала Юзафа Панятоўскага. Адразу распачаўся запіс у Вялікую армію. Служыць у ёй выказалі жаданне амаль усе студэнты Віленскага ўніверсітэта. Узяць у рукі зброю імкнуліся шмат шляхцічаў і людзей з мяшчанскага стану.

Самая ўрачыстая сустрэча была наладжаная ў Менску французскаму маршалу Даву. Віншавальныя прамовы гучалі ў іншых беларускіх гарадах. Вялікую армію віталі каталіцкія і вуніяцкія святары. Яшчэ перад паходам Напалеона яны, нягледзячы на загад царскіх уладаў, адмаўляліся называць у сваіх храмах французскага імператара Антыхрыстам — галоўным ворагам Ісуса Хрыста.

Банапарту прысягнуў былы ігумен віленскага праваслаўнага Святадухаўскага манастыра, а таксама епіскап магілеўскі і віцебскі Варлам ды магілеўскае праваслаўнае духавенства. Епіскап падпісаўся пад зваротам пра далучэнне Магілеўскай губерні да адроджанага Вялікага Княства. Аднадумцам і паплечнікам уладыкі Варлама быў ігумен Арэст. Абодва спадзяваліся стварыць незалежную ад Масквы Беларускую праваслаўную царкву.

Пра тое, з якім уздымам нашы прадзеды чакалі і сустракалі напалеонаўскую армію, можам прачытаць у славутай паэме Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш». Яе героі верылі, што «сам Бог з Напалеонам», а значыць, кожны патрыёт-ліцьвін павінен быць у ягоных шэрагах, каб прынесці роднаму краю вызваленне.

Царскія чыноўнікі ўслед за войскам уцякалі на ўсход, і шляхта для кіравання губернямі і паветамі стварала свае камісіі. Сялянства таксама глядзела на французаў з надзеяй, бо чула, што ў Варшаўскім герцагстве Банапарт ужо скасаваў прыгон. На пачатку вайны сяляне часта дапамагалі напалеонаўскім жаўнерам: паказвалі ім дарогу, хадзілі ў выведку, разам нападалі на маёнткі верных цару памешчыкаў.

У тыя дні ў сэрцах людзей жылі светлыя мары і спадзяванні. Мала хто задумваўся, чаму адмовіўся ўдзельнічаць у вайне Тадэвуш Касцюшка, які жыў тады ў Францыі.

Аднаўленне Вялікага Княства

Напалеон Банапарт добра разумеў, наколькі важна палітыку ведаць гісторыю. Яшчэ ў Парыжы, перад тым, як выехаць да сваіх жаўнераў, ён прысвяціў некалькі дзён вывучэнню мінулага тых мясцін, куды накіроўваў Вялікую армію. Імператару паведамілі пра мары ліцьвінаў не толькі вызваліцца ад расейскай няволі, але і адрадзіць былую дзяржаву.

35 гвардзейцаў-ліцьвінаў Напалеон узяў з сабой у першую высылку на востраў Эльба. Яны складалі амаль палову ганаровай «Эльбаўскай арміі». Пасля высадкі Банапарта на французскі бераг у сакавіку 1815 года ліцьвіны-беларусы ішлі ў авангардзе

У Вільні Напалеон падпісаў указ пра аднаўленне Вялікага Княства Літоўскага з ранейшай сталіцай. Княства складалася з Віленскай, Гарадзенскай, Менскай губерняў і Беластоцкай вобласці, перайменаваных у дэпартаменты. Кожны дэпартамент меў ваеннага губернатара-француза.

У Часовы ўрад Княства ўвайшлі паважаныя асобы са знакамітых ліцьвінскіх родаў: Аляксандр Сапега, Францішак Ельскі, Язэп Серакоўскі, Караль Прозар, Аляксандр Патоцкі. Камітэт народнай адукацыі і рэлігіі ўзначаліў рэктар Віленскага ўніверсітэта славуты вучоны Ян Снядэцкі. Кіраўніком урада стаў граф Станіслаў Солтан.

Дзеля падтрымання парадку ў адроджаным Княстве стварылі сваю паліцыю. Пачалося фармаванне ўзброеных сілаў, якія сталі часткаю напалеонаўскай арміі. Туды ахвотна ўступалі і сяляне. Пасля шасцігадовай службы ім абяцалі вызваленне ад прыгону і зямельны надзел. Усе жаўнеры-ліцьвіны мелі на вайсковай форме кукарды з «Пагоняй».

Нашы продкі ў гвардыі Напалеона

У Вільні Банапарт выдаў таксама дэкрэт пра стварэнне з ліцвінскіх шляхцічаў-добраахвотнікаў 3-га кавалерыйскага палка Імператарскай гвардыі. Для таго, каб зрабіцца гвардзейцам, мала было аднаго жадання. У напалеонаўскую гвардыю залічалі самых адважных, дужых і дысцыплінаваных ваяроў, якія ўжо мелі добры досвед баявых дзеянняў.

Камандаваў 3-м уланскім палком генерал Ян Канопка родам з-пад Слоніма. Ён надзеў вайсковую форму пятнаццацігадовым юнаком. Пазней Канопка браў удзел у вызвольным паўстанні Тадэвуша Касцюшкі. За мужнасць у баях паўстанцаў правадыр узнагародзіў Яна пярсцёнкам з надпісам: «Айчына свайму абаронцу». Як і многія ліцьвіны, пасля паўстання Канопка апынуўся ў Францыі і ўступіў у армію Напалеона Банапарта. З ёю прайшоў тысячы кіламетраў баявых дарог і вызначыўся ў многіх бітвах. У 1811 годзе Ян Канопка атрымаў званне генерала і найвышэйшую вайсковую ўзнагароду — Залаты крыж ордэна «Virtuti Militari».

У 3-м гвардзейскім палку служыла нямала нашчадкаў вядомых ліцьвінскіх родаў: Валовічаў, Ромераў, Плятэраў, Пузынаў, Пуслоўскіх, Тышкевічаў, але большасць складалі дзеці дробнай і беззямельнай шляхты. Да палка далучыўся эскадрон беларускіх татараў на чале з Мустафой Ахматовічам. Гвардзейцы-татары здабылі славу як выдатныя выведнікі.

Шмат беларусаў-ліцьвінаў неслі службу і ў гвардзейскім уланскім палку генерала Вінцэнта Красінскага. Наогул жа, у гвардыі Напалеона ў 1808–1815 гадах налічвалася паўтары тысячы нашых суайчыннікаў. Зазіраючы наперад, трэба адзначыць, што яны заўсёды вызначаліся гераізмам ды захавалі вернасць прысязе і пасля адыходу напалеонаўскіх войск назад за Нёман.

35 гвардзейцаў-ліцьвінаў Напалеон узяў з сабой у першую высылку на востраў Эльба. Яны складалі амаль палову ганаровай «Эльбаўскай арміі». Пасля высадкі Банапарта на французскі бераг у сакавіку 1815 года ліцьвіны-беларусы ішлі ў авангардзе ягонага маленькага войска, якое пераможна вярнулася ў Парыж. У тыя гады пяцьдзясят аднаго ліцьвінскага гвардзейца ўзнагародзілі ордэнам Ганаровага легіёна. Пяцёра атрымалі самую высокую французскую ўзнагароду двойчы, а двое — тройчы.

Ваяры з Беларусі бралі ўдзел і ў апошняй бітве Напалеона пад Ватэрлоа.

Больш даведацца пра тую цікавую старонку беларускай гісторыі вы зможаце, прачытаўшы кнігу даследчыка Уладзіміра Лякіна «Ліцьвіны ў гвардыі Напалеона». Пры канцы кнігі аўтар змясціў 1108 адшуканых імёнаў нашых гвардзейцаў. Магчыма, сярод іх знойдзеце і сваіх продкаў.

Ад Вільні да Віцебска

Напалеон разлічваў паасобку разбіць расейскія арміі паблізу ад мяжы і прымусіць Расею падпісаць мір. Але царскія генералы вырашылі не ўступаць у вырашальную бітву, пакуль не аб'ядналі войскі. Французы ж імкнуліся сарваць гэты план. Каля Кобрына і Міра, блізу вёсак Гудзевічы на Гарадзеншчыне, Салтанаўка на Магілёўшчыне з першых дзён вайны ішлі крывавыя баі.

У ліпені вялікая бітва адбылася каля вёскі Клясціцы, што пад Полацкам. Сам Полацак французы занялі без цяжкасцяў. Адсюль адкрываўся шлях на расейскую сталіцу Санкт-Пецярбург. Тры дні на беразе ракі Дрыса кіпела бітва. Расейцам усё ж удалося спыніць наступ напалеонаўскіх палкоў на Пецярбург. Пад Клясціцамі быў смяротна паранены таленавіты генерал Якаў Кульнёў, дзяцінства якога прайшло ў Віцебскай губерні. Напалеон высока цаніў адвагу праціўніка. Даведаўшыся пра геройскую смерць генерала, французскі імператар паслаў у Парыж адмысловага ганца з лістом, дзе называў Кульнёва адным з найлепшых афіцэраў-кавалерыстаў, з якімі ён сустрэўся ў баях.

Да жніўня Напалеон заняў амаль усе беларускія землі. Роўна праз месяц пасля Вільні Напалеон уступіў у Віцебск. На падыходах да горада, каля мястэчка Астроўна, расейскія войскі зноў сустрэліся з французамі. Бой быў такі цяжкі, што на кожным метры дзесяцівярстовай дарогі ад Астроўна да Лучосы ляжаў забіты ці паранены.

Дзень нараджэння імператара

У Віцебску французскі імператар рыхтаваўся да свайго 43-га дня нараджэння. Ён быў у гуморы. Нягледзячы на цяжкія страты, ягоныя войскі прайшлі ад Нёмана сотні вёрстаў і набылі яму пяць мільёнаў новых падданых.

Паўсюль у беларускіх гарадах вывешвалі партрэты французскага імператара. Газеты пісалі пра добраахвотнікаў, што запісваюцца ў Вялікую армію, і пра ахвяраванні на яе патрэбы. Княгіня Радзівіл ахвяравала дзесяць валоў і дванаццаць бараноў, а нейкі незаможны шляхціч з-пад Наваградка — некалькі фунтаў масла і рэшата яек. Такіх прыкладаў было вельмі багата.

Святкаванне імянінаў Напалеона ў Менску распачалося раніцой сапраўдным канцэртам званоў гарадскіх храмаў. Муніцыпалітэт (гарадское кіраўніцтва) абвясціў пра перайменаванне пляца Верхні рынак у пляц Напалеона. Увечары ў тэатры паказалі спектакль «Вызваленая Літва, або Пераход Нёмана» паводле п'есы пісьменніка Яна Ходзькі. Шэсць тысяч менчукоў сабраліся на святочны маскарад з багатай ілюмінацыяй, усе прыбыткі ад якога былі ахвяраваныя на французскі вайсковы шпіталь.

Вядома, што ў свой першы віцебскі дзень Напалеон адшпіліў шпагу, тэатральна кінуў яе на завалены вайсковымі картамі стол і абвясціў: «Тут я спынюся, злучу карпусы маёй арміі, дам ёй адпачынак і займуся ўладкаваннем гэтай краіны. Паход 1812 года — закончаны!» З Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў Напалеон меркаваў стварыць яшчэ адну падуладную яму дзяржаву пад назвай Беларусь.

Гэтым часам у напалеонаўскім войску служыла прыблізна 25 тысяч беларусаў.

Хто ведае, што сталася б, каб французскі імператар сапраўды спыніўся? Аднак неўзабаве ён перадумаў і, тамсама ў Віцебску, пастанавіў ісці на Маскву.

Пяць пудоў жыта з двара

Хоць прамінула ўсяго паўтара месяца вайны, прыхільнікі Напалеона ў нашай краіне адзначалі яго дзень нараджэння ўжо не так радасна, як віталі пачатак паходу. Заняўшы беларускія землі, Напалеон аб'явіў іх вызваленымі ад расейскага прыгнёту і не скупіўся на шчодрыя абяцанні. Не ўсе разумелі, што французскі імператар вёў сваю гульню. Ён марыў пра панаванне над усім светам, а лёс таго ці іншага народа не надта хваляваў яго.

За абяцанне аднавіць Вялікае Княства Літоўскае Напалеон патрабаваў 100-тысячнае войска і велізарную колькасць харчовых прыпасаў для Вялікай арміі. Часовы ўрад Княства не стаў сапраўдным гаспадаром краіны. Ён не меў права прымаць пастановы без згоды французскага камісара, а таго найбольш цікавіла забеспячэнне Вялікай арміі прадуктамі і фуражом.

Сяляне марна чакалі ад Напалеона адмены прыгоннага права. Замест гэтага ён падпісаў усё новыя і новыя загады пра паборы. Французы гойсалі па вёсках, пакідаючы за сабою пустыя каморы, хлявы і адрыны. Пад выглядам добраахвотных ахвяраванняў салдаты збіралі з кожнага двара па два пуды сена і саломы ды па пяць пудоў жыта і аўса. У жніўні Напалеон выдаў загад, згодна з якім Вялікая армія павінна была атрымаць ад беларускіх губерняў 53 тысячы кароў і 628 тысяч тон збожжа.

Надзеяў на французскага імператара заставалася ўсё менш і менш. Сяляне браліся за косы ды сякеры і ствaралі партызанскія аддзелы, каб бараніцца ад рабункаў.

Паспяховымі нападамі на чужынцаў праславіліся партызаны з прыдзвінскай вёскі Жарцы пад Полацкам. Напярэдадні Барадзінскай бітвы Банапарт вымушаны быў накіраваць ажно 10 тысяч жаўнераў на дапамогу 12-тысячнаму віцебскаму гарнізону, які партызаны амаль што трымалі ў аблозе.

Ад тых часоў захавалася паданне, як у ваколіцах Віцебска Напалеон запытаўся ў бабулі-сялянкі, каму яна зычыць перамогі ў вайне: французам або расейцам. Мудрая беларуска смела і дасціпна адказала імператару: «Хачу, каб вы загналі расейцаў так далёка, што не вярнуліся б ні яны, ні вы».

Уцёкі ў чужым мундзіры

На пачатку верасня каля вёскі Барадзіно за 125 кіламетраў ад Масквы адбылася адна з самых буйных бітваў XIX стагоддзя. З французскага і расейскага бакоў тут сышлося больш за 250 тысяч жаўнераў. У напалеонаўскім войску пад Барадзіном ваявала кавалерыя Дамініка Радзівіла, тысячы беларусаў-добраахвотнікаў, у расейскай арміі — іхнія паднявольныя землякі-рэкруты. Сучаснікі тых падзей з болем пісалі, што брат мусіў ісці на брата.

Барадзінская бітва не выявіла пераможца. Напалеону ўдалося заняць Маскву, але разбіць царскую армію ён так і не здолеў. У кастрычніку французы пачалі адступаць. Расейскія войскі, нярэдка з дапамогаю партызанаў, выбілі войскі Банапарта з Полацка, Віцебска, Магілёва...

Жорсткія баі паміж карпусамі Напалеона і царскімі войскамі адбыліся ў лістападзе на берагах Бярэзіны. Рашучым контрударам французскі імператар прымусіў расейцаў пакінуць Барысаў і пераправіў свае сілы на другі бок ракі. Цяпер на месцах тых баёў, каля вёскі Студзёнка і на Брылёўскім полі паблізу Барысава, створаны мемарыял.

Адступленне яшчэ нядаўна магутнай Вялікай арміі ўсё больш нагадвала ўцёкі.

У беларускім мястэчку Смаргонь Напалеон пераапрануўся ў мундзір польскага ўлана і пад чужым імем пакінуў армію. Недзе ў Беларусі, магчыма, на дне аднаго з нашых шматлікіх азёраў, застаўся ляжаць напалеонаўскі залаты скарб, які яшчэ называюць «залатой карэтай».

Апошні бой на радзіме рэшткі войска Вялікага Княства Літоўскага вялі 10 снежня 1812 года на вуліцах Вільні. З царскімі салдатамі мужна біліся егерскі батальён Плятэра, віленскія гвардзейцы палкоўніка Казельскага, татарскі эскадрон Ахматовіча.

Французскі імператар паабяцаў маршалам і прыдворным, што праз год прывядзе 300 тысяч жаўнераў і ўсё адно паставіць Расею на калені. Але тыя планы не здзейсніліся. Часовы ўрад Вялікага Княства яшчэ блізу года працаваў у Варшаве, Кракаве і Дрэздэне, марна спадзеючыся, што ўрэшце вернецца ў Вільню.

У выгнанні, на закінутым у акіяне востраве Святой Алены, Банапарт прыйшоў да высновы, што прычынай яго разгрому ў 1812 годзе былі ваенныя, а найперш палітычныя памылкі, зробленыя на нашай зямлі. Аўтар гэтых радкоў напісаў пра Напалеона-выгнанца, які ва ўспамінах зноў і зноў вяртаецца ў Беларусь, аповесць «Сны імператара». Гэты твор пераносіць чытача ў Вільню, Віцебск, Смаргонь ды іншыя мясціны на беларускім шляху Вялікай арміі...

Мільён магіл і бясконца рабункі

У 1812-м Беларусь страціла мільён жыхароў, чвэрць усяго насельніцтва. Адны загінулі ў баях, другія памерлі ад голаду і пошасцяў. У асобных гарадах насельніцтва скарацілася ў тры разы. Пад час адступлення напалеонаўскія жаўнеры займаліся непрыхаваным рабаваннем мірнага насельніцтва. Каб расклацсі вогнішча і сагрэцца, яны разбіралі сялянскія хаты. У полымі часта гінулі бібліятэчныя, архіўныя і мастацкія зборы шляхецкіх маёнткаў.

Многія беларускія сяляне, якія змагаліся з французамі ў партызанскіх аддзелах, атрымалі за баявыя заслугі царскія медалі і крыжы, але прыгон пасля вайны толькі ўзмацніўся. Былых партызанаў, якія палічылі сябе за вольных людзей і адмовіліся ісці на паншчыну, памешчыкі загадвалі бязлітасна секчы бізунамі. Чаканне адмены прыгоннага права перакрэслілі словы цара Аляксандра I: «Мужыкам Бог аддзячыць».

Расейцы рабавалі палацы і замкі нашых арыстакратаў, якія падтрымалі Напалеона. З радзівілаўскага Нясвіжа царская адмірал Чычагаў і генерал Тучкоў з памагатымі вывезлі на ўсход сорак вазоў найбагацейшых калекцый: творы беларускіх і заходнееўрапейскіх мастакоў, даўнейшую зброю і музычныя інструменты, каштоўныя кнігі ды рукапісы. Частка нарабаванага трапіла потым у царскія скарбніцы і зборы пецярбургскага Эрмітажа. Углыб Расейскай імперыі з Нясвіжа вывезлі больш за 12 тысяч старадаўніх манет і медалёў. Потым дайшла чарга да геаграфічных карт, паляўнічых стрэльбаў, дываноў і фіранак. Шамбеляна (каменданта) Нясвіжскага замка і слугаў, што таксама захавалі вернасць гаспадару, — князю Дамініку Радзівілу, які ваяваў на баку Банапарта, — расейцы бясконца дапытвалі і катавалі. Яны так хацелі даведацца, дзе галоўныя нясвіжскія скарбы, што некалькіх княскіх слугаў закатавалі да смерці.

Царскія ўлады жорстка каралі прыхільных да Напалеона святароў і царкоўных уладыкаў. Епіскапа магілеўскага і віцебскага Варлама абвясцілі дзяржаўным злачынцам. Яго пазбавілі сану і зрабілі простым манахам, а затым пажыццёва зняволілі ў манастыры, забараніўшы нават пісаць лісты сваякам. Неўзабаве былы ўладыка, які марыў пра самастойную беларускую царкву, страціў здароўе і аслеп.


Тысячы нашых землякоў, якія служылі ў напалеонаўскай арміі, мусілі адступіць за мяжу і ваяваць на чужыне. Апошнія жаўнеры і афіцэры з войска Вялікага Княства вярнуліся на радзіму, калі скончыўся тэрмін іхняй шасцігадовай службы.

Пасля вайны 1812 года тыя, хто марыў вызваліць Айчыну ад расейскага панавання, зразумелі, што трэба разлічваць толькі на ўласныя сілы.

Гістарычная віктарына

1. Чаму для Беларусі вайна 1812 года не была Айчыннай?
2. Раскажыце пра пачатак вайны. Як нашыя продкі сустракалі Вялікую армію?
3. Што Напалеон зрабіў для аднаўлення Вялікага Княства Літоўскага?
4. Чаму беларусы-ліцьвіны ішлі служыць да Напалеона? Колькі нашых землякоў было ў ягоным войску?
5. Што вы даведаліся пра ліцьвінаў у гвардыі французскага імператара?
6. Якое рашэнне прыняў французскі імператар у Віцебску?
7. Чаму беларусы зразумелі, што Напалеону нельга верыць?
8. Як нашы сяляне бараніліся ад рабункаў чужаземных жаўнераў?
9. Чым скончыўся напалеонаўскі паход на Расею?
10. Якую выснову зрабіў Банапарт на востраве Святой Алены?
11. Якія страты прынесла Беларусі вайна 1812 года?

Малюнак Паўла Татарнікава



На гэтым малюнку — Напалеон Банапарт у жніўні 1812-га ў Віцебску, дзе адзначаў свой дзень нараджэння. На той час Напалеон заняў амаль усе беларускія землі. Ён ужо фактычна стаў уладаром кантынентальнай Еўропы. Напалеону здавалася, што Расея таксама пераможаная і яму супраццьстаіць толькі Вялікабрытанія. Менавіта на яе імператар і паказвае эфесам шаблі на карце Еўропы. На другім плане пашыхтаваная старая гвардыя Напалеона як сімвал ягонага вайсковага трыумфу. Удалечыні — сілуэты храмаў тагачаснага Віцебска.

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 2 (150) | 22 лютага 2019 | № 7 (618) Новы час

Арнамент Радзімы



Юрка ГОЛУБ

Планеты

Будзем жыць — як набяжыць,
Прасаваць падэшвай тракты?
Сонца кліча з жытам жыць,
Ночка глушыць нанач трактар.

Неразборку ўсіх планет
Разбіралі ўдома слёзна
Муж вучоны праз ларнет,
Селянін — праз след палозны.

Вынік сведчыў? Скрозь грахі —
Не сцяжына для планетаў.
Слепа верыў ім глухі,
Чуйны вокам быў у нетрах.

Каб залатвіць будняў сэнс,
Лоб падпёр калом сланечнік.
Змізарнеў апошні пенс:
У кішэні ён не вечны.

Сонца ўздыме росаў рой.
Месяц значаць пабрацімы.
У нябёс празрысты крой
І арнамент у радзімы.

Васілёк

Міколу Крукаву, мастаку

І падаў васілёк наўпрост…
Навошта, дружа, падаць.
Віецца побач рэчка Рось —
Над ёю наша праўда.

Стаяць натомлена крыжы
Распятых сухадрэвін.
На скрыжаванні знак крычыць:
Шаша пад шынай дрэмле.

На помач колы клічуць даль.
Мінай канвы канавы.
А там, дзе блішча магістраль,
Агні начы сканалі.

Абмые ранкам жытні плёс
Расы высокай хваля,
Дзе васілька жаданы ўсплёск
Жыты адратавалі.

Не ўзняць угору галавы.
Трава ў рыштоку кленчыць.
А васілёк, глядзі, жывы
У бездані сінечы.

Не страляць

Шкада, а час забыў на сказ,
Што калісьці месціўся ў кішэні.
А прыдаўся б сказ цяпер якраз,
Бо пад кулю паўстаюць мішэні.

Сказ кароткі вельмі:
«Не страляць!» —
Воклічам прастору замыкае.
Днём свістала з'юшана страла,
Уначы хапаліся за камень.

Напладзілася вакол ваяк
Раздзімаюць у шаленстве ноздры.
Кожны з іх па нораву сваяк
У сусветна знанай «коза ностры».

Шкадаванне яловаму лесу

Прытча

Яловы лес нагадваў штольню,
А ў штольні змрок не лашчыць зрок.
Закінуў ён, як ранец школьнік,
Не знацца з цемраю — зарок.

Калі ў галовах чад яловы,
Дык зруб не выведзецца ў лад.
Калі цясляр не адмысловы,
Дык брус яловы вінават.

З успамінаў пра вёску Грынкі

Івану Сухоцкаму

Звон.
Царква.
Паблізу Супрасль.
Сівізна ля галавы.
Асабіста я — не супраць,
Не зважаў, — ці супраць вы.

Божа мілы, адхіснуцца
Ці змаглі б ад той зямлі,
Там, дзе вербы стойма гнуцца
Лежма — рунь на каралі.

Вы слязу не адшукалі,
Не змагліся блазнам быць.
Не ахутаў час шаўкамі:
Як цяперака пражыць?
Загайдалі свет паперы,
Звонка рэхва ў вас блішчыць.
Дык чаму сюды паперлі
Тыя, хто трымалі шчыт?

Адначасна — не трывожна —
Знойдзе сцежка небасхіл.
Кацялок.
Агонь.
Трыножнік.
І на шлях хапае сіл.

Абыдзёншчына

Фэнтэзі

Навокал шмат метамарфоз.
Вось прадзярэцца вока раптам:
Вунь скарацііўся рос завоз,
А вываз міма мытні драпнуў.

Традыцый дзёрскі марадзёр
Завёў у багну спеўны табар.
А закапылены франдзёр
Прымаў авацыю за хабар.

І нечакана, як абвал,
На трасу шчасця морак шаснуў,
Каб сукін сын не забываў:
Дасюль жылося досыць шчасна.

Запомніўся, няйначай, раж:
Гармата ў вераб'я страляла —
Запэўніць свет у соты раз,
Што зброя ў свеце не старая.

І запрыкмеціла — бы цуд —
Абслуга змрочнага тырана,
Як той пісаў маркскі эцюд,
А мора плюскала старанна.

Глядзі! На кукішках пяюн
Напяўся ўзлесці на катурны,
Ды кульбай даў яму Пярун,
Не згодны з ім каларатурна.

На неспазнаных астравах
Дыміцца бровар — калі ласка!
Яго размах — ды не! — замах:
Разбіць аб слуп тваю каляску.

Але найболей і спаўна
Нядаўна грамаду абцешыў
Пясняр цвярозага віна
Пазачарговай, мабыць, цешчай.

Да чуткі — чутка, etc…
Яны заўсёды з вамі вобак.
Сініцу сціснуў у руцэ,
А жураўля шпурляй на воблак.

Фантасмагорыя хмары

Засупонім слова — і на хмару:
Там канца і краю не відаць.
Ведаем,
Кахаемся
Ды марым
Хмару недасяжную дагнаць.

Супыніся ты, мая галуба,
Пуцявіна наша — гэта верш,
І найперш тут вызначаўся лубін…
Не! Яго сінеча ўсё ж найперш.

Бубны зніклі. І замоўклі трубы.
Бераг свету над ракой пусты.
Глянь, высока на стажарным зрубе —
Капяжок ад смолкі — гэта стыль.

Асачыць адсюль ці давядзецца
Кон відушчы сама па сабе?
А прыгоду, што між зор віецца,
Маладзік, як пеўнік, задзяўбе.

І відзён, бы на далоні, хутар.
Маці пры даёнцы і фартух.
Дык навошта зноў душу ахутаў
Да маленства неспазнаны зрух.

Блізка — блізка…
Так!..
Было…
Калісьці…
Жарсць трымцела, каб палёт пачаць.
Хмара — хмара, ты мая калыска:
Хочацца з адчаю закрычаць.

Яблынь квет

А яблынь квет фантомны:
Суквецці беляхцяць.
За плотам не ў прытоме
За свята свеціць сад.

Агораем мы свята
Пры чарцы з рушніка.
Дзяўчаты і салдаты:
Гудзе жыцця рака.

Палянку ў існым садзе
Шукаў аблок чарод.
А побач — глянь — засада:
Ім пастку ладзіў дрот.

Ды ў яблынь волкі вэлюм:
З такім імкнуцца ў рай.
Яго мы песцім вельмі:
На хутары — у Зэльве —
Любові цераз край.

Трыялет касца

Адкляпаў ён касу, як верш:
Звоніць каса яго залатая.
Касавільна касу вітае
І касцом вітае найперш.
Блешча ўранку срэбрам атава,
У нябёсах касец вітае.
Адкляпаў ён касу, як верш:
Звоніць коска яго залатая.

Усё яшчэ будзе



Наста КУДАСАВА

* * *

цыравала надрывы, хавала рубцы,
забівала дарэмныя вокны,
але восень прысела ў мяне на гаўбцы
і завыла воўкам.
завывай жа,
зрывай гэты зманлівы рай:
хай у схібах гартуецца схіма,
хай нясецца душа з горкіх шахт на-гара —
міма часу
і болю
міма.

* * *

ты не кліч, не заві,
толькі верасень — мой візаві.
колькі север і вусціш сівілы ў маёй крыві.
але кожным радком я малю цябе, любы,
жыві!
аддавайся дарогам, заблуквай
у хмельных травах…
салаўіныя сэрцы кунеж,
заварожвай і княж!
так, бязлітасны час,
але жыць немагчыма інакш,
бо любоў ахінае сабой
свет няўрымслівы наш,
асвятляючы ўсё —
нават самую простую яву.

* * *

там, дзе лета ахоўвае
шчасця няўлоўнага трымт,
дзе зялёнага лесу наўсцяж
раскашуецца хорам,
там па сцежках чароўных
чароўныя ходзяць звяры,
там дагэтуль жывыя —
давер, спагада і сорам.
лапкай мыш бласлаўляе мурог,
а вавёрка дупло
высцілае любоўю —
сасны гаспадарлівы пробашч…
там на сцежках зямных
мы зямное люляем цяпло
бо не трэба ні раю, ні выраю
там, дзе ты побач.

* * *

трыццаць два, а дагэтуль — голая,
без'языкі пакорлівы голем.
не ўрастае ў мяне,
не прымаецца
ні стырна —
толькі крык і памяць.
ты пашый мне кашулю крылатую
з веры кропнай,
спагады мятнай
і пусці мяне ў рай абязболены —
рай дзяцей, сабак і анёлаў.

* * *

так свяціцца Імя,
так ідзе Валадарства Тваё,
быццам хтосьці ў грудзях мне прарэзаў
аконны праём
і ўтрапёна ўзіраецца ў свет
зноў жывымі вачыма —
сумны вязень, даўно забыты,
дзівак нічыйны.
кажа:
«Госпадзе, ну і адчайная ж
воля Твая!
але што ні дасі, вось ён я —
Твой маленькі ваяр!
Твой даверлівы блазан,
пылок на Тваім плашчы…
праўда ж, хороша разам, скажы?
ну, чаму Ты маўчыш?
хай да моташы ўвішнае тло
мне давалася ў знакі,
але ўсё, што я вынес адсюль, —
гэта енк падзякі.
вось я —
выціснуў боль,
выбіў змрок,
перажыў зіму.
…ладна,
Бог з ім, са словам,
я веру
й дыханню
Твайму».

* * *

Схамяніся, самотная схімніца, бачыш,
ветах да вуліцаў хіліцца,
тонкай ножкай
жывое намацвае
між дамамі, палацамі, пляцамі.
Схамяніся,
пачуй, як упрошвае:
«Не згарай! Дарагая, харошая…
Між аблудаў пустэчы прагорклай
не згарай,
будзь маёй зоркай…»



Фота 64parallel

Бруклінскі мост

З нізкі «Уладзевы гісторыі»



Уладзімір СІЎЧЫКАЎ

Вокладка ці пераплёт?

Абмяркоўвалі аднаго дня партнёры-выдаўцы новую серыю — размоўнікі-даведнікі.

Пагадзіліся, што пачынаць трэба будзе з самых запатрабаваных і распаўсюджаных еўрапейскіх моў, што ў «размоўнай» частцы будуць тры калонкі: іншамоўная, перакладная і калонка практычнай (вульгарнай, спрошчанай) транскрыпцыі.

Вырашылі, што ў размоўніку будуць уключаны найчасцей ужываныя словы і выразы, якія варта згрупаваць па тэматычных раздзелах: «На мяжы», «У гатэлі», «У горадзе», «Пакупкі», «Славутыя мясціны» і падобныя.

Палічылі, што тэматычныя раздзелы варта дапоўніць заўвагамі і даведкамі, якія будуць утрымліваць карысную найперш турыстам інфармацыю, а таксама міні-слоўнічкі.

— Зразумела, што паперу дзеля эканоміі дамо газетную, — разважаў Алег, — і што фармат будзе адназначна кішэнны...

— Я сказаў бы, што кішэнна-сумачны, бо размоўнік можна насіць не толькі ў кішэні, але і ў барсэтцы, і ў дамскай сумачцы, — мякка ўдакладніў Уладзя. — Мне дык падабаецца 70x100/32.

— А гэта колькі пасля абрэзу?

— 165 на 115 міліметраў.

— Ну, можа быць. А вось з якога варыянта вокладкі пачаць — з мяккага ці з цвёрдага?

— Паліграфісты цяпер прыглядаюцца, спрабуюць засвоіць і трэці ды, мабыць, актуальны, так званы інтэграваны пераплёт...

— Гэта калі ў «крышкі» закладаецца зусім тонкі, амаль што бязважкі кардон?

— Ну, так. Але ж мы прафесіяналы, а таму прапаноўваю скарыстоўваць не дылетанцкую, а прафесійную лексіку, тэрміны і азначэнні выдаўцоў і паліграфістаў. Мяккая вокладка — гэта і ёсць уласна вокладка, а так званая цвёрдая вокладка — гэта пераплёт!

— Згода, — кіўнуў Алег, — але мяркую, што трэба будзе рабіць два варыянты — і ў вокладцы, і ў пераплёце. Так сказаць, танны, дэмакратычны, а таксама больш прэзентабельны, але, як мінімум, на даляр даражэйшы варыянт.

— Я прапанаваў бы пачаць з вокладкі.

— Якія будуць аргументы?

— Я лічу, што размоўнікі-даведнікі набываюць, каб чэрпаць з іх найперш практычную інфармацыю, — пачаў здалёк Уладзя. — А таксама дзеля псіхалагічнай упэўненасці — маўляў, у складанай сітуацыі кніжка дапаможа. Але на вуліцах ні ў нямецкім Франкфурце-на-Майне, ні ў польскай Варшаве, ні ў каталонскім Січэзе, што пад Барселонаю, ні ў амерыканскім Нью-Ёрку не бачыў я турыста ці камандзіраванага па справах з разгорнутым размоўнікам! Хаця пара-тройка іншамоўных фраз спрыяе лепшаму стаўленню тубыльцаў на рэцэпцыі ў гатэлі ці на базары...

— Але якое дачыненне ўсё гэта мае да тыпу вокладкі? — нецярпліва перапытаў Алег.

— Зразумела, што за мяжу ездзяць не самыя бедныя людзі. Ім нібыта ўсё адно — аддаць за размоўнік-даведнік па даляр болей ці меней. А з другога боку, дзе найчасцей гартаюць тыя размоўнікі? У дарозе ці на... пляжы!

— І што з таго?

— А тое, што пакладзе адпачыннік наш томік у вокладцы ў пляжную сумку разам з мокрым купальнікам і ручніком, а той набрыняе вільгаццю, распухне дый сапсуецца!

— Ну дык і добра! — усклікнуў Алег.

— Як гэта — добра?! — здзівіўся ягоны калега. — Усіх нас выхоўвалі, прывучалі ашчадна ставіцца да кніг!

— Так, але да чужых, пазычаных у сябра або ўзятых на абанемент у бібліятэцы! Са сваімі ж можна і трэба абыходзіцца куды вальней. Можна рабіць пазнакі на маргінэзах, можна падкрэсліваць упадабаныя ці важныя радкі, можна дамалёўваць свае ілюстрацыі...

— Усё гэта слушна... А ўсё ж не разумею, што добрага ў тым, што размоўнік размокне і сапсуецца?!

— Ды тут усё проста! — Алег вытрымаў эфектную паўзу і патлумачыў: — Турыст набудзе іншы і, хутчэй за ўсё, гэткі самы, ужо звыклы размоўнік! Значыць, мы прадамо не адзін, а два асобнікі!

— Ну, гэта проста нейкі апафеоз цынізму! — толькі і змог сказаць Уладзя.

— Ды не! Апафеоз — гэта пазіцыя нашага калегі Якава Міхайлавіча Х. ці, як завуць яго сябры, проста Яна. Ён любіць казаць, што выдаўцы, нібыта ілюзіяністы, мяняюць адну паперу на іншую, ператвараюць газетную альбо афсетную паперу ў вокладкі ці ў пераплёце ў стосікі зялёных простакутнічкаў з партрэтамі Бенджаміна Франкліна! Трэба памятаць, што і наш асветнік, гуманіст і першадрукар Францішак Скарына не толькі перакладаў, аздабляў, друкаваў Біблію, але і прадаваў яе, зарабляў выдавецкай справаю! Таму і мы не толькі мусім несці люду паспалітаму добрае, разумнае, вечнае, але і не забывацца, што ёсць прадпрымальнікамі, а значыць павінны мець прыбытак і плаціць падаткі!

Народны ілюзіяніст

На адным са штогадовых міжнародных кніжных кірмашоў, што праходзіў у сталічным Палацы мастацтва, прыпыніўся Уладзя каля століка свайго калегі, пісьменніка і выдаўца В. Х. і мімаволі загледзеўся на ягоныя маніпуляцыі.

На століку ляжалі з паўдзясятка кніжных выданняў, і на ўсіх былі пазначаныя неверагодна высокія кошты. Калі чарговы наведвальнік выставы-кірмашу і патэнцыйны пакупнік пытаўся, чаму тая ці іншая кніга такая дарагая, дык спадар Валер, і брывом не варухнуўшы, тлумачыў: «Шкада аддаваць, бо гэта апошні асобнік. Таму і цана адпаведая...»

Але, як толькі пакупнік адыходзіў з набыткам, спадар Валер спрытна выхопліваў з кардоннай скрыні, прыхаванай пад столікам, гэткі самы асобнік і выкладваў яго на агляд і на продаж.

— Ну, ты, Валер, малайчына! — удавана захоплена зазначыў Уладзя. — Увіхаешся, нібыта той ілюзіяніст у цырку!

— Называй як сабе хочаш — хоць ілюзіяністам, хоць эквілібрыстам, а хоць і гіпнацізёрам! Але трэба ж неяк круціцца, каб акупіць хаця б арэнду гэтага імправізаванага стэнда!

— Мабыць, трэба будзе ўзяць на ўзбраенне твой фінт, — не пакідаў свайго іранічнага тону Уладзя, аднак калега таго нібыта не заўважаў.

— Ну, наконт гэтага як сабе хочаш. Але ма́ю да цябе адну вельмі сур'ёзную прапанову...

— Прапановы любыя, асабліва сур'ёзныя, я ахвотна выслухоўваю дый разглядаю.

— Ты ж ведаеш, што акрым усяго я яшчэ і лекар.

— А як жа ж! Памятаю, бо гэта пазначана на тваёй візітоўцы. Ну дык і што?

— Выдай мой траўнік-даведнік з каляровымі ілюстрацыямі! Гарантую, што саракатысячны наклад разляціцца імгненна!

— Пачакай, ты, здаецца, сам выпускаў яго ў сваім выдавецтве...

— Ну, калі гэта было! Гадоў з дзесяць таму!

— Тады лічы, што твая прапанова ўжо разгледжаная.

— Ну, і... — са спадзяваннем выдыхнуў спадар Валер.

— Як выдавец, ты мусіш ведаць: кожны аўтар лічыць, што ягоны твор, ягоны рукапіс ці друкапіс — надзвычай таленавіты, запатрабаваны і значны, што менавіта яго нецярпліва чакаюць чытачы і спажыўцы, што выдавец недаацэньвае яго і таму губляе сваю выгоду...

— Ну, ведаю! — нецярпліва перапыніў спадар Валер. — Але не цягні, кажы па сутнасці!

— А па сутнасці — час гэткіх траўнікаў даўно мінуўся, і якраз гадоў з дзесяць таму сышоў на нішто і попыт на іх.

— Ды не, я б сам перавыдаў яго, — млява прагаварыў спадар Валер. — Проста ў мяне цяпер не стае абаротных сродкаў!

— Але ж я не ілюзіяніст, каб дастаць з капелюша тыя самыя сродкі! А з другога боку, чаму гэта ты раптам так палюбіў мяне, што дорыш проста залатыя горы?!.

Бруклінскі мост

У пазамінулым стагоддзі цяперашнія складнікі Нью-Ёрка выспа Манхэтан ды раён Бруклін былі асобнымі гарадамі і мелі патрэбу злучацца пэўнай магістраллю. Прапанова пра падземна-падводны тунэль не прайшла, а прынялі праект стальнога вісячага моста інжынера Джона Роблінга. Небарака загінуў на будаўніцтве Бруклінскага моста (Brooklin Bridge), але справу цягам трынаццаці гадоў давялі да канца ягоны сын Вашынгтон, а пасля ягонай траўмы — жонка Эмілі.

Гэты неагатычны — аўтамабільны, веласіпедны і пешаходны — цуд не можа не ўражваць: ягоная шырыня складае 26 метраў, даўжыня 1825, а асноўны пралёт 486,3 метра! Ён занесены ў спіс Нацыянальных гістарычных славутасцяў, а дзякуючы галівудскім кінастужкам лічыцца адным з сімвалаў мегаполіса.

Паказаць яго Уладзю ўзялася доччына сяброўка Вераніка.

Прайшлі ледзь не ўвесь яго пешкі, зрабілі некалькі дзясяткаў фотаздымкаў на айфоны, прачыталі ці не ўсе надпісы на шыльдах, мемарыяльных дошках і дарожных указальніках, падзівіліся майстэрству праекціроўшчыкаў і будаўнікоў, палюбаваліся на гарадскія краявіды з хмарачосамі, верхнія паверхі якіх хаваліся ў дажджавых хмарах.

— На хорошее
и мне не жалко слов.
От похвал
красней,
как флага нашего матéрийка,
хоть вы
и разъюнайтед стэтс
оф
Америка, —

прадэкламаваў Уладзя, а пасля паўзы прадоўжыў:

— Смотрю,
как в поезд глядит эскимос,
впиваюсь,
как в ухо впивается клещ.
Бруклинский мост —
да...
Это вещь!

— Каго гэта вы цытуеце? — спыталася заінтрыгаваная Вераніка.

— Ведаеш, за савецкім часам некалькі беларускіх паэтаў пабывалі ў Нью-Ёрку прадстаўнікамі Беларускай ССР на сесіях Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый: Рыгор Барадулін, Пятрусь Броўка, Кандрат Крапіва, Пімен Панчанка... — пачаў здалёк Уладзя. — Максім Танк нават выдаў кніжку публіцыстычнай прозы «Недыпламатычныя нататкі», а Анатоль Вярцінскі — не менш публіцыстычных нататак «Нью-Йоркская сірэна». Пазней, у часы незалежніцкія Генадзь Бураўкін быў тут цэлыя чатыры гады за сталага прадстаўніка Рэспублікі Беларусь пры ААН. Але вось не магу прыгадаць аніводнага годнага верша пра Бруклінскі мост, хоць і не выключаю, што такія ёсць. Не цытаваць жа другасны, прасавецкі верш-агітку «Маякоўскі каля Бруклінскага моста» Петруся Броўкі! Вось таму і даводзіцца дэкламаваць радкі самога Уладзіміра Маякоўскага. Найперш паэт і мастак, ён, калі не памыляюся, у 1925 годзе некалькі месяцаў гойсаў па паўночнаамерыканскім кантыненце, рыхтаваў публікацыі ў часопіс «Огонёк» ды ў газету «Известия», а таксама ладзіў свае творчыя вечарыны.

— Вы ж таксама праводзілі тут свае імпрэзы...

— Ну, покуль што было іх усяго толькі тры дый маю гэтым разам у Амерыцы менш за тры тыдні, — удакладніў Уладзя і задумліва дадаў, пазіраючы на Нью-Ёрк скрозь моставыя ванты:

— Отсюда
безработные
в Гудзон
кидались
вниз головой.

— Які жах! — усклікнула Вераніка.

Уладзя крыху збянтэжана зірнуў на дзяўчыну, а праз хвіліну схамянуўся, паспешліва загаварыў да яе:

— Ты выбачай, Вераніка! Я нічога не меў на ўвазе! Проста чамусьці ў голаў прыйшлі і гэтыя радкі... А новую працу ты неадменна і хутка знойдзеш!

— Я гэта ведаю і асабліва не турбуюся, — супакоіла дзяўчына і гарэзліва дадала: — Затое магу падарыць вам сёння сваё свежаспечанае адкрыццё!

— Гэта якое ж?

— Ды ваш цёзка ледзь не сто гадоў дурыць людзей!

— Ну, ведаю, што мусіў паэт адпрацоўваць і свае немалыя камандзіровачныя. Дый увогуле нярэдка быў ён двухаблічны. Насіў, да прыкладу, амерыканскія дыхтоўныя чаравікі, як на знакамітым фотапартрэце Аляксандра Родчанкі, а сам, як зацяты рэкламшчык, складаў слоганы пра савецкія галёшы кшталту: «С помощью «Резинотреста» / Мне везде — сухое место!» Але ж Бруклінскі мост папраўдзе ўразіў паэта, і ён шчыра ў тым празнаваўся!

— Але я маю на ўвазе не савецкую ідэалогію, а факталагічную памылку!

— Так, цікава! Патлумач...

— Беспрацоўныя аніяк не маглі кідаца ў Гудзон з гэтага моста, бо злучае ён два берагі зусім іншай ракі!

— Як гэта?

— А вельмі проста — пад намі нясе сваю плынь Іст-рывер! А рака Гудзон працякае амаль што паралельна, але з іншага, процілеглага боку Манхэтана, самага дарагога вострава ў свеце!

Біблійны Адам

У Нью-Ёрку, у Беларускай фундацыі Крачэўскага Валянціна Трыгубовіч расказала Уладзю, як на адной з навукова-практычных канферэнцый яна, тады маладая яшчэ даследчыца-мастацтвазнаўца, сарамліва і асцярожліва звярнулася да найпаважанага прафесара Адама Мальдзіса:

— Выбачайце, спадар Мальдзіс, але, да свайго сораму, не ведаю, як зваць вас па бацьку...

Адказ быў і з намёкам на пашанотны ўзрост, і з самаіранічнай адсылкай да часоў біблійных:

— Ну, па-першае, вы ўжо паспяхова звярнуліся да мяне — беларусы могуць цудоўна абыходзіцца і без імя па бацьку. А па-другое, хіба ў Адама быў бацька?

Пакінуў Пятро Ластаўка…

Наспеў час сабраць пад адну вокладку мастацкія і гісторыка-краязнаўчыя ўспаміны беларускага грамадска-культурнага дзеяча і публіцыста Пятра Ластаўкі (1907–1968) з Варшавы.

Ён у свой час актыўна друкаваўся на старонках заходнебеларускага друку, беластоцкіх тыднёвіка «Ніва» і «Беларускага календара», быў сябрам Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы (БГКТ).

Беларускімі справамі Пятро Ластаўка захапіўся яшчэ тады, калі яму было толькі 14 гадоў, распаўсюджваючы нелегальныя адозвы, кніжкі, газеты…

Ён нарадзіўся 16 лютага 1907 года на Дзісеншчыне ў беднай беларускай сялянскай сям'і. Вельмі рана застаўся без бацькоў, таму яшчэ хлопчыкам зведаў нялёгкую фізічную працу парабка і пастуха. Калі яму споўнілася 19 гадоў, уступіў у Беларускую сялянска-работніцкую Грамаду і стаў яе актыўным сябрам на Дзісеншчыне. За гэтую дзейнасць маладога Ластаўку польскія ўлады арыштоўвалі і саджалі за краты ў Глыбокім, а пасля ў Вільні. Потым выпускалі — і за ім кантралявала паліцыя.

У канцы 1920-х гадоў Пятра Ластаўку забіраюць у польскае войска. Адбыўшы вайсковую павіннасць, ён зноў вяртаецца ў родную вёску і працягвае беларускія справы. Але паліцыя ад яго не адставала. Тады юнак вырашае пакінуць родныя мясціны і едзе ў Варшаву.

З цягам часу знайшлася праца. Пятро Ластаўка знаёміцца з многімі беларусамі Варшавы, а пасля арганізуе асветнае таварыства беларусаў. Гэтае таварыства дзейнічала да пачатку вайны, а Пятро Ластаўка быў яго самаахвярным кіраўніком.

Калі пачалася Другая сусветная вайна, Пятро Ластаўка пакінуў Варшаву і пераехаў жыць у Забалацце Белападляскай гміны, але сувязі з сябрамі-беларусамі не губляў. Ды і там ён праводзіў цікавыя імпрэзы, сустрэчы.

Пасля вайны Пятро Ластаўка вяртаецца ў Варшаву і жыве ў Мілянуўцы. Ён па-ранейшаму не пакідае беларускіх спраў, актыўна ўключаецца ў працу Варшаўскага аддзела БГКТ. Доўгі час з'яўляецца сябрам яго праўлення, а пазней і сябрам прэзідыума. А калі БГКТ займела права займацца гаспадарчай дзейнасцю, то спадар Ластаўка становіцца дырэктарам прамысловага прадпрыемства «Бэтэска» і кіруе гэтым прадпрыемствам ажно пяць гадоў.

Пятро Ластаўка быў і апантаным калекцыянерам, кнігалюбам, займаўся публіцыстыкай і літаратурай. Юры Туронак згадваў, што пасля смерці Ластаўкі, у 1968 годзе, яму пашанцавала купіць усю яго калекцыю — блізу 20 беларускіх кніг, выдадзеных у ваенны час у Берліне, Варшаве і Менску.

Пры жыцці Пятро Ластаўка цікавіўся лёсам варшаўскіх беларусаў. Мне прыемна згадваць сёння гэтага чалавека і таму, што ён добра ведаў і шчыра сябраваў у Варшаве з маім земляком Гальяшом Леўчыкам. Асабліва спадара Ластаўку цікавіў лёс паэта пасля 1944 года. 10 лютага 1967 года Пятро Ластаўка звярнуўся нават у ЗША да Яна Пятроўскага з просьбаю напісаць успаміны пра духоўнае жыццё Леўчыка. Ластаўка пісаў Пятроўскаму: «Пішу ўспаміны пра Гальяша Ляўковіча. І дзеля гэтага хацеў бы прыгадаць варшаўскі час такім, якім ён быў у сапраўднасці. Хіба вы не ведаеце, што Леўчык ужо не жыве. Ён памёр у верасні 1944 года на атаку печані ў цяжкіх абставінах, бо не было ніадкуль ніякае помачы… У наступным лісце перашлю Вам болей звестак пра апошні час жыцця і смерць Ляўковіча» (Ян Пятроўскі. Мэмуары. Слуцак–Гэйнсвільл, 1988). Далей у пісьме Яну Пятроўскаму Ластаўка пісаў, што ён ужо два гады як цяжка хварэе. »У маім далейшым лісце да Ластаўкі, — згадваў далей у сваіх »Мэмуарах» Ян Пятроўскі, — ад 24 чэрвеня 1968 года я пытаўся, як ён маецца і яшчэ раз прасіў падаць мне звесткі, якія адносяцца да апошніх дзён Ляўковіча. Але на гэты мой ліст я ніколі ўжо не атрымаў адказу».

Ян Пятроўскі звяртаўся з просьбаю і да сына Пятра Ластаўкі, але адказу больш ад сям'і Ластаўкаў не атрымаў. Відаць, яго дзяцей беларускія справы і лёсы беларусаў ужо не цікавілі. Тым больш, што 19 верасня 1968 года беларускага дзеяча ў Варшаве не стала…

Артыкулы Пятра Ластаўкі на самыя розныя тэмы раскіданы па газетах і часопісах мінулага стагоддзя. Адно праўдзівае здарэнне «Трое сяброў» прапаную «Літаратурнай Беларусі». Яно публікавалася ў месячным рэлігійным часопісе «Zlucennie» ў лістападаўскім нумары за 1938 год.

Сяргей Чыгрын

Трое сяброў

Праўдзівае здарэнне

Пасля сусветнай вайны Сцяпан паступіў на фабрыку. Не любіць горада, але недахоп зямлі ў дома і брак заработку змусілі яго да гэтага жыцця.

Як толькі атрымаў водпуск, не чакаючы доўга, купіў білет, сеў, як кажуць, на »шалёну кабылу» і паехаў у родную вёску.

Вечарам зірнула апошняя станцыя. Сэрца яго забіла нейкая радасць. Усё знаёмае, блізкае… Шыбка мінаў вузенькія, гразныя вулічкі добра ведамага яму мястэчка. Хутка дайшоў да поля, поля сваёй ужо вёскі.

— Здароў, брат, — пачуў за сабою голас Лявона. Быў то сябра з дзіцячых гадоў.

— А нішто, як ты? Я, як бачыш, трымаюся. Што чуваць у нашым родным кутку? — спытаў Сцяпан.

— Гарачыня ў нас, бачыш. Днём дык і не паказвайся ў полі… Вось, што схваціш раненька з расой ці вечарам — то і наша. Бачыш, і цяпер вяртаюся з касой. Некаторыя дык нават ноччу косяць.

— Як трэба, дык трэба. А як мы парымся круглы год у душнай фабрыцы…

— Вось і мая хата, — сказаў Лявон, затрымаўшыся перад вёскай, — мо зойдзеш адпачыць?

— Дзякуй. Пайду да брата. Недалёка.

— Мо ў нядзелю прыйдзеш?

— Добра, пастараюся, — сказаў Сцяпан і пайшоў далей.

Перад хатай спаткаў Сцяпана брат: »Чаму ж не папярэдзіў? Конь свой, запрог бы і пад'ехаў».

— А, што там. З прыемнасцю прайшоў гэтыя два кіламетры.

— Пячы, жонка, яешню, маем госця, — звярнуўся брат Сцяпана да жонкі, калі ўвайшлі ў хату.

— Няхай братавая не клапоціцца. Які я там госць, — бараніўся Сцяпан, — свой. Заўтра касу на плечы і да работы пайду… А ведаеце, — змяніў тэму Сцяпан, — ідучы, спаткаў Лявона, як жа ён пастарэў.

— Старэе, — пацвердзіў брат, — але і дзіўны зрабіўся пасля вайны. Ні да людзей, ні да Бога, — нідзе яго не спаткаеш: ні ў царкве, ні на вёсцы. Замкнуты ў сабе.

— Прасіў, каб заглянуў да яго. Гэта ж мой найлепшы сябра з-прад вайны.

Селі вячэраць.

— Ну, раскажы, што ў свеце новага? — звярнуўся брат да Сцяпана.

— А, сённяшні свет не варт гэтага слова. Гэта не свет, а нейкі кацёл, у якім усё кіпіць і кіпіць, і што з гэтага будзе, ніхто не ведае.

Пасля вячэры Сцяпан пайшоў на свежае сена. Зарыўся з прыемнасцю ў ім і, неўпарадкаваўшы часу думак, заснуў. Калі прачнуўся, сонца ўжо было высока. Выйшаў за гумно, кінуў вачыма ў шырокае поле і ўдыхнуў з жаднасцю свежага паветра.

— Шчасце, — падумаў, — гэта мець свой кавалачак зямелькі і працаваць на ім…

Дзень за днём шыбка мінаў. Надышла нядзеля. Паснедаўшы, пайшоў Сцяпан у царкву. Памаліўся за свой народ. Пасля набажэнства спаткаў шмат знаёмых. Пагутарыў крыху то з тым, то з іншым. Калі вяртаўся дахаты, зайшоў да Лявона.

— Думаў, што будзеш у царкве і разам прыйдзем, — сказаў Сцяпан, калі ўвайшоў у хату.

— Не сабраўся ніяк, — адказаў той, убіўшы вочы ў зямлю.

— А мой ты суседзька, думаеце, што ён ходзіць у царкву? — падхапіла жонка.

— Ужо пачынаеш, — перарваў яе Лявон, — дайце лепш супакой гэтай гутарцы. Падавай на стол, — звярнуўся ён да жонкі.

— Што гэта знача? Пра царкву не гавару. Чаму? — пытаў сябе ў думцы Сцяпан. — Перад вайной гэтакі быў рэлігійны, гэтак гарнуўся да малітвы і царквы, а цяпер?.. І абразоў нат няма, — кінуў на сцяну, — хоць ты бяры шапку і ўцякай з гэтай нары. Але не, — падумаў, — трэба аб гэтым пагаварыць.

Выпілі па чарцы. Крыху павесялеў Лявон.

— Як бачу, то ў цябе і абразоў няма? Што з табой? — пачаў Сцяпан.

— Браток, каб ты ведаў гісторыю майго жыцця, то не дзівіўся б, — адказаў Лявон.

— Мо раскажаш?

— Усё гэта вайна, — уздыхнуў Лявон. — Сколькі ж яна нарабіла крыўд людзям… Сколькі ж згубіла душ…

— І тваю пэўна, — падхапіў Сцяпан.

— Каб ты ведаў…

— Кажы ад пачатку. Слухаю.

— Цяжка пра гэта гаварыць, але табе, і ў дадабак пры чарцы, адважуся.

— Кепска, што адвагу маеш пры чарцы, — стыдзіў Сцяпан.

— Пачалася вайна. Ідзе чалавек з вёскі і гораду. Знаходзіцца ў моры натоўпу людзей. Моладзь і моладзь. А ведаем, што найбольш моладзь адварочваецца ад Бога. Моладзь, моладзь, чуючы сябе сільнай фізічна, думае, што жыццё яе ёсць вечнае, і дзеля таго перастае верыць. І калі чалавек знаходзіцца сярод гэтых масаў, хутка асімілюецца, становіцца бязбожнікам — так і са мной сталася… Пачаткава быў я ў расейскай арміі, пасля рэвалюцыі перайшоў у польскае войска. Усюды бязбожнасць, нявера… — цяжка уздыхнуў Лявон, узяў люльку, закурыў і распавядаў далей. — Было нас трох сяброў: адзін жыдок, другі палячок-камуніст і я. Адной ноччу, пасля наступлення на бальшавікоў, ляжалі мы за ўзгоркам. То там, то сям чуваць былі стрэлы. Перад намі на пагорачку стаяў крыж. Не гледзячы, што два дні трывала барацьба на адным месцы, крыж і фігура Хрыста былі не зачэплены. І не ведаю, які чорт падсунуў мне думку, кажу да іх: »Хто ж з нас лепшы стралок і пападзе ў фігуру?..» І, доўга не думаючы, пацэліў і стрэліў. Не папаў, закрануў толькі дрэва крыжа. Тады жыдок кажа: »Ты не стралец, вось я дык пападу». І праўда, злажыўся і папаў у самую галаву фігуры, паміж вачэй. Трэці стрэліў і таксама папаў у левы бок, ніжэй сэрца. Калі ўглядаліся мы, убачылі, як пацякла кроў з ран. Перамяніліся мы позіркамі між сабой, нічога не кажучы. Толькі жыдок прамовіў: »Е, галюцынацыя».

Назаўтра з самай раніцы зноў наступленне. Пачалі гнаць бальшавікоў. Мы заўсёды разам. У пэўнай хвіліне, здаецца, і стрэлаў не было, жыдок крыкнуў і паваліўся. Мы да яго… І мароз прайшоў па скуры. Куля трапіла якраз у гэта самае месца, у якое ён Хрыста стрэліў. Глянулі мы на сябе, усталі і бяжым далей. За хвіліну і палячок дагары нагамі паляцеў. Спалохаўся я, углядаюся, нідзе нічога, а ўжо ён і не жыве. Разарваў я адзенне, а яму куля прайшла ніжэй сэрца. Вось я і задрыжаў… Божанька, — кажу, — не карай мяне смерцю, я ж толькі дрэва закрануў… Не паспеў усташ, а тут ззаду бальшавікі… Ну і забралі мяне ў палон… І што ты на гэта ўсё скажаш? — спытаў Лявон і змоўк.

— Панеслі адпаведную кару за свае ўчынкі перад Богам, — сказаў Сцяпан.

— Добра, яны не жывуць і не мучацца, а мяне ўвесь час ад гэтага грызе сумленне.

— Яны згубленыя, а ты можаш яшчэ ўратаваць сваю душу. Бог ёсць міласэрны, толькі трэба ўпакорыцца, памаліцца, можа, пашкадаваць за свае грахі, а тады адыдзе ад цябе жуда, сумленне тваё супакоіцца, і будзеш шчаслівы. Чаму гэтага не зробіш? — пытаў Сцяпан з выкідам. — У царкву ходзіш?

— Не магу. Пайшоў раз, то ў маіх вачах здалося, што ўсе святыя пачалі мяне стыдзіць і казаць, што я нягодны там прыхадзіч. І праўда, калі падумаю, што я столькі брахаў, як сабака, проці Бога і Веры святой, то і сапраўды я нягодны, стыдаюся людзей і баюся Бога, папросту, хоць ты жывы ў сырую зямельку ўцякай…

— Не спадзяваўся я, што ты такі нясведамы, — сказаў Сцяпан. — Зрабі, што я табе параджу, не страціш гэтым нічога. Кінь усю работу і пайдзі заўтра з сямі раніцы да споведзі. Паманіся шчыра. Кайся сваіх праступкаў, і пабачыш, як шчаслівы прыйдзеш дахаты. Ведай тое, што Бог ёсць так добры, як бацька свайго дзіцяці, каторае, яшчэ яно нядобрае, а ўсё ж і памагае яму ў чым толькі зможа — таксама і Бог за шчырую малітву і каянне прыгарне да свайго сэрца кожнага чалавека… Ну, але я загаварыўся, як баба, там чакаюць.

— Мо і праўду кажаш. Нікога я не спаткаў, каб мне дарадзіў, а жыццё маё цяжкае, цёмнае… жуда і сум агарняюць маю душу.

— Тады будзе сонечнае і вясёлае, пабачыш… Ну бывай, а заўтра ведаеш, што трэба зрабіць, — паціснуў руку Лявона і выйшаў.

Прайшло пару дзён. Трэба было ўжо вяртацца Сцяпану ў горад. Калі меў ад'ехаць, прыйшоў Лявон, каб адвесці на станцыю. У дарозе не закрануў гэтай тэмы. Толькі на станцыі Лявон крэпка абняў Сцяпана і сказаў: «Ведаеш, браток, паслухаў цябе. Цяпер чуюся іншым. Жыццё перад сабой бачу пекнае, яснае… Вельмі цешуся, што Усемагутны Бог прыслаў да мяне найдаражэйшага мне з дзіцячых гадоў сябра, а цяпер праведніка, які паказаў мне дарогу да збаўлення душы. Бывай. Буду памятаць цябе заўсёды і прашу: не мінай маёй хаты ніколі».

Сцяпан ад'ехаў, глыбока задуманы выццём свайго сябра, а Лявон вярнуўся да хаты шчаслівы і вясёлы.

Пятро Ластаўка

Новая «Справа»

Тэма новага нумара беларуска-ўкраінскага альманаху «Справа» — каханне і любоў.

Яна арганічна вызначылася пасля таго, як рэдакцыя альманаху паездзіла з прэзентацыямі папярэдняга выдання, тэмай якога быў боль. Так, боль — галоўная тэма літаратуры. Болю шмат, і таму яму быў прысвечаны папярэдні нумар. Але менавіта любоў і каханне — гэта тое, што ўраўнаважвае боль. Любоў і каханне — гэта агонь, што асвятляе ноч. А можа, менавіта гэты ракурс — адзіны, дазваляе бачыць сутнасць рэчаў? Так ці інакш, менавіта каханне і любоў трымаюць наш свет і не даюць яму зваліцца ў прорву болю…

Прафесар Галіна Яструбецкая з Луцка пранавала надзвычайна цікавы матэрыял пра каханне ў жыцці Васіля Стуса — паэта, які вызначаў твар украінскай літаратуры ў 70-х гадах, Героя Украіны, дысідэнта, выбітнага стыліста, які быў, дарэчы, родам з Данецка.

Знаёмства на Кангрэсе даследчыкаў Беларусі са спадарыняй Алай Брадзіхінай «абярнулася» артыкулам пра тэатралізацыю кахання ў сучаснай беларускай літаратуры…

І хто так напіша пранізліва пра любоў да сваёй мовы, як настаўніца з Дывына Кобрынскага раёна Надзея Момлік? Вершы спадарыні Надзеі ўнікальныя сваёй дакументальнасцю — рэдка паэзія (ды і наогул літаратура) так поўна раскрывае карціну чужога жыцця.

Успомнім і паэзію Ірыны Цілык: кожны яе верш — сапраўдная гісторыя; аўтарка па спецыяльнасці з'яўляецца рэжысёрам — і з дакументальнай падрабязнасцю паэтызуе рэальнасць. У яе вершах — гісторыя сучаснай украінскай штодзённасці. Цілык і іншыя сучасныя ўкраінскія паэты публікуюцца ў падборцы вершаў «Толькі не пра вайну», якую з цеплынёй склаў наш сябар з Кіева літаратуразнаўца Вячаслаў Лявіцкі.

Новая «Справа» адкрывае беларусам Юлю Фінкоўску — надзвычай таленавітую ўкраінку, «вытканую» з любові, якая закахалася ў беларускую мову і стала пісаць на ёй вершы, поўныя фарбаў, пахаў і колераў.

Успамінаем і класікаў. І як! Ёсць у нумары бліскучы дыялог артыкулаў: Ігар Альшэўскі з Украіны і Ганна Севярынец з Беларусі спрабуюць разабрацца ў мужчынскай натуры Уладзіміра Сасюры, які, падчас прыезду ў Беларусь, здаецца, «закахаўся ва ўсіх беларускіх дзяўчат, разам і паасобку».

У гэтым нумары публікуюцца лісты ўкраінскіх пісьменнікаў да вядомага беларускага празаіка Івана Шамякіна, падрыхтаваныя яго дачкой спадарыняй Алесяй.

У раздзеле «Літаратуразнаўства» Зінаіда Дудзюк з Брэста публікуе лісты, якія атрымлівала ад пісьменніцы з Камянца Святланы Курылёвай. Святлана Курылёва запомнілася тым, што пісала апавяданні «з жыцця правіцы», публікуючы іх у дзяржаўных выдавецтвах у савецкія часы, і выкарыстоўвала ў мастацкай прозе мясцовую гаворку.

Публікуюцца і краязнаўчыя матэрыялы ад прызнаных аўтараў. Так, любоўю да праўды вызначаецца тэкст дацэнта Ігара Кузняцова. Яго артыкул распавядае пра тое, як цынічна вырашаўся лёс берасцейцаў — вязняў НКВД, у рэшце рэшт расстраляных савецкімі карнымі органамі ў Брэсцкай крэпасці перад уцёкамі ад немцаў улетку 1941 года. Парадокс сітуацыі ў тым, што ў крэпасці вісіць памятная табліца гэтаму карнаму атраду НКВД, але няма і згадкі аб бесчалавечных, бяссудных расстрэлах…

Брэсцкая крэпасць — гэта і іншыя гістарычныя фарбы, пра якія трэба памятаць. Крэпасць — гэта, па-першае, стары Брэст: менавіта тут існаваў горад да прыходу рускіх ваенных інжынераў у XIX стагоддзі. Але, выяўляецца, крэпасць — гэта яшчэ і першы ўкраінскі тэатр у Брэсце! Аб зараджэнні тэатра распавядаецца ў матэрыяле Аксаны Палій.

«Справа» публікуе і дзве чытацкія рэакцыі на навуковы артыкул Яраслава Антанюка з Луцку, прысвечаны баявым дзеянням УПА на Берасцейшчыне. Адзін тэкст — ліст чалавека, чыя сям'я стала відавочцамі тых падзей. Неверагодны выпадак, калі мова архіўных дакументаў ажывае ў сямейнай гісторыі. Другі ліст — чытацкія тлумачэнні да артыкулу Антанюка, дапоўненыя ўнікальнымі дакументамі з Пінскага занальнага архіва. З іх можна даведацца, як рэагавалі на УПА і АУН мясцовыя жыхары і чаму далучаліся да іх.

…А пачынаюць гэты нумар вельмі цёплыя выказванні пра Украіну Уладзіміра Караткевіча. Мабыць, не будзе перабольшваннем сказаць, што яго светапогляд ды літаратурны талент у многім сфармавалі гады навучання ў Кіеўскім універсітэце ды работы настаўнікам у сяле пад Кіевам. На ўсё жыццё ў яго засталася любоў да Украіны. «І як ёй аддзячыць? Хіба што адказваючы любоўю на Любоў. А большага яна і не патрабуе».

Альманах можна набыць у кнігарні «Акадэмкніга» і ў прыватных распаўсюднікаў.

Прыемнага чытання!

Наталка Бабіна, старшыня Таварыства ўкраінскай літаратуры пры СБП

«Расціць з жалудоў дрэвы»

Лепшыя творы пішуцца з болю. Гэтую сентэнцыю ярка ілюструе новая кніга паэзіі Алеся Аркуша «Возера Вялікае», якая нядаўна пабачыла свет дзякуючы выдавецкай ініцыятыве «Полацкае ляда».

Алесь Аркуш пачынаў свой літаратурны шлях вершамі, але ў апошнія гады амаль цалкам пераключыўся на прозу. Адзін за адным ён выдаў пяць раманаў. І вось новая кніга паэзіі — «Возера Вялікае». Яна прысвечаная бацькам аўтара, якія не так даўно пакінулі гэты свет.

пабачыліся абняліся
і развіталіся
да наступнай Радаўніцы

Возера Вялікае — гэта родныя мясціны маці паэта, куды ў маленстве ён часта прыязджаў. Гукі, пахі, відзежы тых ваколіцаў асабліва выразна абудзіліся пасля таго, як хата прадкаў абязлюдзела. Але ў падсвядомасці ўсё захавалася нязменным.

упарта згадваю
адну і тую ж відзежу
па вузкакалейцы
едзе цягнічок
гружоны торфам
так выразна яго бачу
што магу
распазнаваць лічбы
на бартах вагонаў
грукоча цягнічок коламі
мільгаціць у вачах лічбамі
ужо і следу не засталося
ад той вузкакалейкі
а цягнічок усё некуды
спяшаецца

Ці вось яшчэ:

чаму я заўсёды
пазнаю цябе
вецер з аеравым пахам

Незваротны сыход родных абвастрае ўнутраны зрок, выхоплівае з краявіду нябачныя раней праявы.

ля драўлянай капліцы
якая хутчэй награваецца
ад веснавога сонца
шчыльным гуртом
грэюцца замшэлыя
уросшыя ў зямлю
надмагільныя камяні

Душа, збалелая ў суме па страчаных крэўных, робіць простыя, здавалася б, адкрыцці:

раптам усведамляеш
у гэтай капліцы
сумоўнічалі з Хрыстом
тры пакаленні тваіх продкаў

На ўласным шляху да вечнасці паэта часта наведвае пачуццё дарогі ў нікуды.

бляклае святло месяца
ледзь прыкметная дарога
і ўсё
і больш нічога
толькі поле і дарога
у нікуды
да месяца
і зор

Вярэдзіць паэтаву душу і марнасць многіх ведаў і ўмельстваў, калі ніхто ў свой час не навучыў галоўнаму — гадаваць жыццё…

калі збіраў пад дзедавым
дубам жалуды
згадаў як у школе
на ўроках працы
нас вучылі рабіць
з іх чалавечкаў
і цэлы дзень
думка не давала
мне спакою
чаму нас не навучылі
расціць з жалудоў
сапраўдныя дрэвы

ВА, svaboda.org

Нямецкі бестсэлер — па-беларуску

(Прыгоды няўрымслівых блізнятак)

Прыгоды Луізы і Лоты: авантурны раман для дзяцей / Эрых Кэстнэр; пераклад з нямецкай Галіны Скакун; мастачка Наста Арайс. — Мінск: Тэхналогія, 2018. — 159 с.



70 гадоў таму нямецкі паэт, празаік і сцэнарыст Эрых Кэстнэр напісаў раман для дзяцей «Незвычайныя прыгоды Луізы і Лоты» («Das doppelte Lottchen»), які стаў адным з літаратурных бестсэлераў. У Германіі гэты твор вытрымаў больш за 160 перавыданняў, быў неаднойчы экранізаваны і перакладзены на некалькі дзясяткаў моў. Беларускія чытачы сёння могуць пачытаць яго на роднай мове дзякуючы творчай працы перакладніцы Галіны Скакун.

Гісторыя пачынаецца ў дзіцячым летніку: тут сустракаюцца дзве абсалютна аднолькавыя дзяўчынкі: Луіза, якая жыве разам з бацькам у Вене, і Лота, якая жыве з матуляй у Мюнхене. Дзяўчынкі шчырыя і непасрэдныя, але маюць розныя характары: Лота — мілая і спакойная, Луіза — няўрымслівая, дасціпная і вясёлая. Дзякуючы старому сямейнаму фотаздымку Луіза і Лота высвятляюць, што яны сястрычкі-блізняткі, і прыдумваюць фантастычны план — бо вельмі пасябравалі і хочуць заўсёды быць разам. Тут і пачынаюцца сапраўдныя — абсалютна жыццёвыя — прыгоды, якія дакладна захопяць маленькіх чытачоў і слухачоў. Дынамічны сюжэт, шчаслівы фінал, пазітыўныя героі, якія вераць, што ўсё атрымаецца (паспрабаваць у любым выпадку варта!), — усё гэта гарантуе выдатныя ўражанні ад знаёмства з творам.

Кніга атрымалася прыгожай і светлай дзякуючы арыгінальным ілюстрацыям ад мастачкі Насты Арайс. На гэтых малюнках нямала герояў, добра знаёмых па іншых дзіцячых творах: цікаўная эканомка, разумны, праніклівы доктар, эгаістычная прыгажуня сярэдніх гадоў, якая ледзь не стала мачыхай для Луізы і Лоты… Ёсць у кнізе і традыцыйныя, прадказальныя для дзіцячай кнігі сітуацыі і здарэнні. Што робіць раман унікальным, дык гэта цэнтральная праблема, да вырашэння якой Эрых Кэстнэр далучае сваіх герáінь.

У творы ёсць дзве цэнтральныя ідэі, і цяжка вызначыць, якая з іх галоўная. З аднаго боку, пісьменнік гаворыць пра вялікую значнасць сям'і, з іншага боку, паказвае, што жыццё толькі з мамай ці толькі з татам — не самае жахлівае для дзіцяці. Першая ідэя паслядоўна абгрунтоўваецца ў творы: Луіза і Лота вельмі радыя, што сустрэліся, і мараць бачыць сваіх бацькоў заўсёды побач, яны ўпэўненыя, што геніяльны кампазітар (тата) і выдатны фатограф (мама) проста павінны быць разам дзеля сваіх мілых дачушак. Што тычыцца другой ідэі, то (як на наш час) Эрых Кэстнэр вельмі акуратна і далікатна паказаў, што толькі з мамай ці толькі з татам таксама можна выдатна бавіць час: кавярня, тэатр, выходныя на прыродзе, — усё гэта цудоўна, і калі бацькі не жывуць разам, гэта зусім не жыццёвая катастрофа. Зрэшты, сам Эрых Кэстнэр меў сына, але ніколі не знаходзіўся ў афіцыйным шлюбе.

Стасункі паміж дарослымі апісваюцца даволі спрошчана, аўтар відавочна пазбягаў негатыву і тлумачыў усе няправільныя ўчынкі неабачлівасцю, імпульсіўнасцю ды празмернай патрабавальнасцю герояў. Ён прапанаваў дзецям ставіцца да непаразуменняў паміж бацькамі максімальна проста, не пускаць у душу крыўду, абурэнне, маркоту. Вельмі верагодна, што гісторыя «дарослых» дачыненняў для большасці маленькіх чытачоў застанецца незаўважанай. Затое авантурны раман «Незвычайныя прыгоды Луізы і Лоты» можа стаць выдатнай падказкай для пісьменнікаў, якія адрасуюць свае творы дзецям і хочуць у цікавай форме данесці некалькі сур'ёзных ідэй.

Паводле залатога стандарту еўрапейскай літаратуры, кніга вучыць заўважаць пазітыўнае, радаснае ў звычайным жыцці: гульнях, стасунках з блізкімі людзьмі, — і рабіць для іншых прыемныя неспадзяванкі, адзначаць штодня невялікія перамогі. Атрымалася зварыць суп ці палепшыць почырк — цудоўна, адзнака 10! Вось і гераіням заўсёды шанцуе, і нават калі ўсё, здаецца, зусім блага, на дапамогу прыходзяць добрыя зычлівыя людзі.

З кнігай пра Луізу і Лоту можна вельмі ўтульна правесці вечар і разам з дзецьмі ўзгадаць важныя рэчы, якія аб'ядноўваюць кожную — і вялікую, і малую — сям'ю.

Ганна Скрыпка

ПРЭМІІ

Букераўская прэмія і «Man Group»

Як вынікае з прэс-рэлізу «Man Booker Prize», адна з самых прэстыжных узнагарод у свеце англамоўнай літаратуры абвясціла аб тым, што супрацоўніцтва «Booker Prize Foundation» і кампаніі «Man Group», якая спансавала літаратурную ўзнагароду, завершана.

«Man Group» была спонсарам прэміі «Man Booker Prize» з 2002 года, калі канадскі пісьменнік Ян Мартэл быў названы пераможцам (за раман «Жыццё Пі»). За 18 гадоў фундатарства «Man Group» перадала 25 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў на развіццё літаратурнай узнагароды і падтрымку англамоўнай і сусветнай літаратуры.

Цяпер вядуцца перамовы з новым спонсарам, і адміністратары прэміі выказваюць упэўненасць, што новае фінансаванне будзе забяспечана. Між тым, сёлета літаратурная ўзнагарода будзе працаваць у звычайным рэжыме.

Кампанія «Man Group» плануе канцэнтраваць рэсурсы на рэалізацыі ўласнай праграмы развіцця бізнэсу «Пракладваючы шлях», накіраванай на пашырэнне разнастайнасці ў галіне глабальных дабрачынных ініцыятыў фірмы і дабрачыннага фонда «Man».

«Кампанія «Man Group» была выдатным і вельмі шчодрым спонсарам амаль 18 гадоў. Дзякуючы яе падтрымцы мы бачылі, як квітнелі прызы і дабрачынная дзейнасць, і сёння тыя прызы могуць прэтэндаваць на званне самых значных літаратурных узнагародаў у свеце. Мы хацелі б афіцыйна падзякаваць за дабрачыннасць «Man Group». Аднак усё добрае мусіць закончыцца, і мы з нецярпеннем чакаем магчымасці атрымаць прызы на наступны этап ад нашага новага прыхільніка», — сказала старшыня «Booker Prize Foundation» Хелена Кэнэдзі.

Прэмія Бажова

У Екацерынбургу дваццаты раз адбылося ўрачыстае ўручэнне прэміі імя Паўла Бажова.

Год для расійскай літаратурнай узнагароды стаў двойчы юбілейным: споўнілася 20 гадоў з дня яе заснавання і 140 гадоў з дня нараджэння патрыярха ўральскай літаратуры Паўла Бажова.

На конкурс было прадстаўлена 79 кніг прозы, паэзіі, публіцыстыкі і 17 асветніцкіх праектаў. І хоць прэмію называюць уральскай, яе аўтары жывуць ад Далёкага Усхода да Памор'я, а таксама ў ЗША, Германіі ды Ізраілі.

Лаўрэатам 2018 года ў катэгорыі «Майстар. Проза» стаў екацерынбургскі пісьменнік Аляксей Сальнікаў з раманам «Апасродкавана», у намінацыі «Майстар. Паэзія» перамог казанскі паэт Аляксей Астудзін з кнігай вершаў «Вішнёвы сайт», у намінацыі «Майстар. Публіцыстыка» лаўры пераможцы атрымаў маскоўскі журналіст, аглядальнік «Расійскай газеты» Дзмітрый Шэвароў за «Каляндар паэзіі». У намінацыі «Карысць справы» лаўрэацтва атрымаў чалябінскі праект «Анталогія сучаснай уральскай паэзіі».

«Гэта няпростая гісторыя. Газетным публікацыям папярэднічала вялікая праца для душы: я складаў анталогію рускай паэзіі, каля 12 гадоў збіраў вершы, і мне хацелася падзяліцца тым, што асвятляе вечнасцю нашае хуткаплыннае жыццё», — распавёў Дз. Шэвароў пра свой праект. Журналіст перакананы, што дзень стварэння верша паэтам з'яўляецца не менш важнай датай, чым дзень нараджэння самога паэта. Ён адзначыў, што пік актыўнай творчасці рускіх паэтаў не абавязкова прыпадае на восень, як у Пушкіна: «Яны паспяхова ствараюць і ў іншыя часы года, — гэта залежыць ад узросту, ад таго, калі нарадзіўся сам паэт…».

Канстанцін Паўстоўскі і Нобелеўская прэмія

З нядаўна апублікаваных архіўных дакументаў Шведскай акадэміі вынікае, што вядомы савецкі пісьменнік Канстанцін Паўстоўскі тры разы прэтэндаваў на Нобелеўскую прэмію па літаратуры.

Архіўныя матэрыялы Шведскай акадэміі, якія тычацца прэтэндэнтаў на Нобелеўскую прэмію, захоўваюцца 50 гадоў — і толькі потым іх абнародваюць. Таму і стала вядома, што імя папулярнага літаратара прысутнічала ў спісе кандыдатаў у 1965 і 1967 гадах, а ў 1968 годзе К. Паўстоўскі прысутнічаў сярод шасці асноўных прэтэндэнтаў на прэстыжную літаратурную ўзнагароду.

ТАСС працытавала запіс тагачаснага старшыні камітэта Нобелеўскай прэміі Андэрса Эстэрлінга з каментарыямі пра «выпадзенне» яго імя са спісу кандыдатаў: «З-за смерці Канстанціна Паўстоўскага [14 ліпеня 1968 года] са спісу гэтага года сыходзіць адна з самых прывабных прапаноў. Гэта сумна, паколькі гэтая руская кандыдатура мела добрыя шанцы на бліжэйшую будучыню».

Акадэмія амерыканскіх паэтаў

Фонд Эндру Мелана вылучыў Акадэміі амерыканскіх паэтаў 2,2 мільёна долараў ЗША.

«Гэта, безумоўна, самае вялікае ахвяраванне, якое Фонд Мелана калі-небудзь рабіў у гонар якога-небудзь віду мастацтва», — адзначыла прэзідэнт Фонда Мелана паэтка Элізабэт Александэр.

Грашовыя сродкі падзеляць на два гранты. Першы дапаможа пачаць новую праграму стыпендый для падтрымкі паэтаў-лаўрэатаў штатаў, гарадоў, тэрыторый Злучаных Штатаў ці племянных нацый па ўсёй краіне. Прыём заявак адкрыты з 15 студзеня. І ўжо ў красавіку Акадэмія амерыканскіх паэтаў вызначыць ад 10 да 20 стыпендый на суму ад 50 да 100 тысячаў долараў кожная.

Цяпер у Злучаных Штатах Амерыкі налічваецца 45 паэтаў-лаўрэатаў і больш за 40 паэтаў у гарадах, якія закліканы прасоўваць мастацтва на рэгіянальным і мясцовым узроўнях. Тым не менш, большасць з іх атрымліваюць сціплую кампенсацыю, калі такая наогул маецца. Стыпендыя Акадэміі амерыканскіх паэтаў дапаможа прафінансаваць творчыя праграмы паэтаў.

Другі грант пойдзе на Кааліцыю Паэзіі — нацыянальны альянс з больш чым 20-ці паэтычных арганізацый, некаторыя з якіх з'яўляюцца некамерцыйнымі. Фінансаванне падтрымае працу кааліцыі на працягу наступных чатырох гадоў і дапаможа стварыць пілотную праграму стыпендый, якая прапануе працу на няпоўны працоўны дзень у асобных арганізацыях-членах.

Акадэмія амерыканскіх паэтаў была заснавана ў 1934 годзе. Яна клапоціцца пра развіццё паэзіі, курыруе шэраг праграм і праектаў, такіх, як вэб-сайт Poets.org і Нацыянальны месяц паэзіі, заснаваны ў 1996 годзе.

Якія кнігі чытаюць украінцы?

Украінцы чытаюць сучаснікаў, усё часцей выкарыстоўваюць гаджэты і адмаўляюцца ад рускамоўнай літаратуры.

Такія вынікі даследавання, праведзенага «Цэнтрам Разумкова» пры падтрымцы Украінскага культурнага фонду. Былі апытаныя 2013 рэспандэнтаў ва ўзросце ад 15 да 59 гадоў з усіх рэгіёнаў Украіны.

Згодна з вынікамі, найбольш папулярным украінскім пісьменнікам застаецца Ліна Кастэнка. Менавіта яе імя адразу назвалі 10% апытаных. Другое месца дасталося сучаснаму паэту Сергію Жадану, — пры згадванні ўкраінскіх пісьменнікаў яго ўспамінаюць 7% рэспандэнтаў. Трэцяе месца падзялілі класік сучаснай літаратуры Юрый Андруховіч (4,7%) і пісьменніца Аксана Забужка (4,3%).

14% апытаных не змаглі ўспомніць ніводнага пісьменніка, яшчэ 13,8% не змаглі адказаць, а 9,9% — так і не адказалі…

«Разабраліся» і з любімымі жанрамі года: траціна ўкраінцаў чытала дэтэктывы (34%), крыху менш — класіку (32%), чвэрць абрала фантастыку і падручнікі (па 24%) і крыху менш за чвэрць — кнігі па псіхалогіі і самаразвіццю (23%).

Амаль палове ўкраінцаў (45,3%), паводле згаданага сацыялагічнага апытання, не важна, на якой мове чытаць літаратуру. Пры тым 33,3% з іх нават гатовыя чытаць кнігі на мове арыгіналу, якім бы ён ні быў. У астатніх выпадках часцей выбіраюць рускую — 28,3%, на роднай жа мове зручней чытаць 24,2% рэспандэнтаў.

Па словах сацыёлагаў, выбар мовы кнігі часта залежыць ад таго, на якой чытач мае зносіны ў сям'і. Дык вось, 47% апытаных дома гавораць на ўкраінскай, а 31% — на рускай. Паказальна, што за чатыры гады выкарыстоўваць украінскую ў побыце сталі часцей, а выбіраць рускамоўныя кнігі сталі радзей.

Чытаюць украінцы традыцыйна дома — 58%. На другім месцы стала праца, а на трэцім — дарога (у дарозе чытаюць 13% украінцаў, асабліва гэта тычыцца жыхароў вялікіх гарадоў).

Большасць украінцаў усё яшчэ аддае перавагу друкаваным кнігам: іх некалькі разоў на тыдзень чытаюць 16%, электронныя ці аўдыякнігі — адпаведна 4% і 11%. Наогул жа за 2018 год 31,3% грамадзянаў Украіны карысталіся электроннымі, а 16,9% — аўдыёкнігамі.



Фота www.lifehacker.ru

Муракамі — «ізгой японскага літсвету»?

Самы папулярны ў свеце японскі пісьменнік, заўзяты аматар джазавай музыкі і бегу, перакладчык і пустэльнік-літаратар Харукі Муракамі будзе святкаваць свой 70-гадовы юбілей.

Ва ўсім свеце літаратурная грамадскасць лічыць яго японскім пісьменнікам. У Японіі кнігі Х. Муракамі карыстаюцца не меншым попытам. Аднак там і да гэтага часу працягваюцца спрэчкі пра «сумнеўнага японскага» літаратара, а сам ён пра сябе гаворыць так: «Я ізгой японскага літаратурнага свету».

12 гадоў таму Такійскі ўніверсітэт разам з Фондам японскай культуры правялі сімпозіум пад назвай «Паляванне на Харукі», на які сабраліся 25 перакладчыкаў з 17-ці краін. Кожнаму з іх на форуме задавалася адно і тое ж пытанне: «Што японскае вы ўбачылі ў пісьменніка, якога ў нас лічаць занадта празаходнім?»

У Японіі людзі сталага веку, прывучаныя расцэньваць унутраную свабоду ў адценнях сораму, лічаць яго занадта незалежным і «моршчацца» ад яго раманаў. А «сівыя самураі», якія аддалі жыццё служэнню дзяржаве, называюць яго «вестэрнізаваным».

Сам пісьменнік яшчэ ў 2004 годзе, жартуючы, казаў: «Я не разумею, што гэтым старым буркунам ад мяне трэба! Я пішу пра Японію і японцаў. На японскай мове. І перш за ўсё для японскіх чытачоў. Што яшчэ трэба, каб мяне лічылі японскім пісьменнікам?!».

У інтэрв'ю выданню «The Guardian» Харукі Муракамі распавёў: «Мы, японцы, якія нарадзіліся адразу пасля вайны, раслі на амерыканскай культуры. Я слухаў амерыканскія джаз і поп, глядзеў амерыканскія тэлешоў — гэта было акно ў іншы свет. Аднак я патроху намацаў свой уласны стыль. Не японскі і не амерыканскі — проста мой, і ўсё… Я вельмі люблю Габрыэля Гарсія Маркеса, але я не стаў бы называць яго рэалізм «містычным». Гэта проста яго ўласны рэалізм. Вось і мой стыль, хутчэй, падобны на мае ж акуляры: пры поглядзе менавіта праз гэтыя лінзы свет вакол набывае для мяне сэнс».

У падрыхтоўцы старонкі выкарыстаны матэрыялы novostiliteratury.ru, «Ex Libris», ТАСС, «Новой газеты» і «The New York Times».

Літаратурная Беларусь

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by